

НЮАНСЫ ЖЫЛЛЁВАГА ЗАКАНАДАЎСТВА 7

БІБЛІЯ НА МОВЕ ПАЛЕШУКОЎ 12




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

29 СТУДЗЕНЯ 2019 г. АЎТОРАК № 18 (28885)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Максім ЕРМАЛОВІЧ, міністр фінансаў:**

*«Бюджэт Беларусі за 2018 год выкананы з прафіцытам больш чым $2 млрд у эквіваленце. Гэта досыць высокі вынік, што дазваляе нам з аптымізмам глядзець у будучыню, нягледзячы на тое, якое «надвор'е» будзе ў сусветнай эканамічнай сістэме. Стабільнасць дасягнута за кошт двух асноўных фактараў — агульнай эканамічнай палітыкі дзяржаўных органаў, а таксама за кошт узважанай і абдуманай бюджэтна-падатковай палітыкі, накіраванай у тым ліку на павышэнне эфектыўнасці кіравання дзяржаўнымі сродкамі. Гэта ўсё ў сукупнасці і дае канчатковы вынік — даходы растуць, а выдаткі бюджэту забяспечваюць эфектыўнае аказанне бюджэтных паслуг грамадзянам».*

# ТОЛЬКІ СНЕГ З-ПАД ЛАП!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У Лагойскім раёне на базе адпачынку «Плешчаніцы-2» прайшоў Міжнародны фестываль аматараў ездавога спорту «Паўночныя сабакі — 2019». Гаспадары сібірскіх хаскі, аляскінскіх маламутаў, паляўнічых лаек і аўчарак з Беларусі, Расіі і Украіны спаборнічалі ў лыжных і санных гонках-забегах.**

## КОРАТКА

• Вышыня снежнага покрыва ў Гомелі ў тры разы перавысіла сярэднія шматгадовыя значэнні, характэрныя для канца студзеня.



**• Беларускі біятланіст Мікіта Лабастаў выйграў «серабро» ў індывідуальнай гонцы на юніёрскім чэмпіянаце свету ў Славакіі.**

• У Віцебскай вобласці агульная падлеткавая злачыннасць у 2018 годзе ў параўнанні з 2017-м знізілася на 13,5 %.

**• Гродзенскія міліцыянеры па заяве сваякоў адшукалі ў Расіі зніклага 21 год таму мужчыну.**


ISSN 1990 - 763X


Грошы

# ДАПЛАТЫ МАМАМ І ПАЖЫЛЫМ

### З 1 лютага павышаюцца некаторыя пенсіі і дапамогі на дзяцей

**З наступнага месяца традыцыйна вырасце бюджэт пражытковага мінімуму (БПМ), а ўслед за ім падымуцца ўсе выплаты, прывязаныя да яго. Так, змены закрануць мінімальныя працоўныя і сацыяльныя пенсіі, аднаразовыя дапамогі пры нараджэнні дзяцей і некаторыя іншыя выплаты. Памер БПМ складзе 216,9 рубля.**

### ЯК ЗМЕНЯЦЦА ПЕНСІІ

Сацыяльная пенсія інвалідам 1-й групы, у тым ліку інвалідам з дзяцінства, складзе 238 рублёў (110 % ад БПМ), інвалідам з дзяцінства 2-й групы — 206 рублёў (95 % ад БПМ), іншым інвалідам 2-й групы, а таксама дзецям у выпадку страты карміцеля — 184 рублі (85 % БПМ), інвалідам 3-й групы — 162 рублі (75 % БПМ).

Пенсія дзецям-інвалідам да 18 гадоў, у залежнасці ад ступені страты здароўя, складзе ад 173 да 238 рублёў.

У сувязі са змяненнем БПМ павялічацца таксама надбаўкі, павышэнні да пенсіі і даплаты беларусам, якім 75 гадоў і больш, а таксама дапамогі па доглядзе інваліда I групы або асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту.

СТАР. 4

Сам-насам

# «МАЁ ЖЫЦЦЁ — ГЭТА БЕГ З ПЕРАШКОДАМІ»

**Ніка Мікалаеўна ШЫШКІНА, удава Героя Савецкага Саюза, легендарнага ваеннага лётчыка 1-га класа Якава Шышкіна, і сама асоба легендарная: гуляла ў валейбол з маршалам Ракасоўскім, была знаёмая з Юрыем Гагарыным і сябравала з сям'ёй сына Анастаса Мікаяна. Нягледзячы на свае 90, асвоіла камп'ютар і па скайпе кантактуе з сяброўкай у Ізраілі і сваячкай у ЗША, сочыць за падзеямі ў спорце (бо чатыры дзесяцігоддзі адпрацавала ўрачом у дыспансеры спартыўнай медыцыны, і многія беларускія спартсмены дагэтуль жаданыя госці ў яе кватэры), мае выдатнае пачуццё гумару і ніколі не скардзіцца на свае балячкі. Яе сям'я адносілася да сапраўднай савецкай эліты, але жыццёвы шлях Нікі Мікалаеўны ніколі не быў засцелены ружамі: яна рана засталася без мужа, а затым і без адзінага сына, сама змагалася з цяжкай хваробай, але не страціла цікавасць да жыцця. Справіцца з цяжкасцямі дапамагала работа — 60 гадоў жанчына адпрацавала ўрачом, і толькі ў 81 год сышла на заслужаны адпачынак.**



Фота Андрэя САЗОНАВА.

СТАР. 11

# ЯРКА І ПРЫГОЖА, ЭМАЦЫЯНАЛЬНА І ДУШЭЎНА

## Чэмпіянат Еўропы завяршыўся, але Мінск не развітваецца з фігурным катаннем, а кажа «яшчэ пабачымся»

**Наша краіна падобны старт у гэтым відзе спорту прымала ўпершыню, але са сваім дэбютам справілася на выдатна. Чэмпіянат Еўропы па фігурным катанні — адзін з найстарэйшых турніраў на кантыненце, яго прымалі ўжо 24 краіны (часцей за ўсё Швейцарыя), такога гонару ўдастоіліся 49 гарадоў, зараз у гэтым спісе ёсць і Мінск.**

Асвятляць турнір у сталіцу Беларусі прыехалі больш за 400 журналістаў, паводле звестак Беларускага саюза канькабежцаў, чэмпіянат наведалі 105 тысяч гледачоў. З іх 90 тысяч склалі прададзеныя білеты, а 15 тысяч месцаў былі распаўсюджаны бясплатна для прадстаўнікоў школ, дзяржаўных прадпрыемстваў і іншых катэгорый грамадзян. У гэтыя дні трыбуны «Мінск-Арэны» стракацелі разнастайнасцю сцягоў. Нядзіўна: каля 30 тысяч месцаў выкупілі замежныя балельшчыкі з больш чым 30 краін свету, уключаючы Японію, Чылі, Германію, Італію, Славакію, Францыю, Літву, Латвію, Чэхію і інш. Тэлевізійная карцінка чэмпіянату транслявалася на 20 краін, уключаючы ЗША, Кітай, Бразілію і Японію. Пасля такіх лічбаў пытанняў аб маштабах і ўзроўні турніру проста няма.

Да нядзелі ўсе медалі чэмпіянату знайшлі сваіх уладальнікаў, гэта наймацнейшыя спартсмены ў фігурным катанні. На працягу чатырох дзён яны дэманстравалі невераг одны прафесіяналізм, гераізм і дазволілі гледачам адчуць велізарны спектр эмоцый. Маштабнае мерапрыемства завяршылася гала-прадстаўленне, дзе прызёры і пераможцы чэмпіянату Еўропы паказалі свае найлепшыя нумары. На шоу прысутнічаў і **Прэзідэнт Аляксандр ЛУКАШЭНКА**. Пасля заканчэння ён выйшаў на лёд разам з удзельнікамі спаборніцтваў.

*«Выходзячы на гэты лёд «Мінск-Арэны», я перш за ўсё падумаў пра мужнасць»*, — сказаў кіраўнік дзяржавы, адзначыўшы, што фігурысты на лёдзе зусім не абароненыя, але пры гэтым яны паказваюць вельмі складаныя элементы. *«Не хакеісты самыя мужныя людзі, а вы»*, — звярнуўся ён да ўдзельнікаў.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта прыгожае дзейства — чэмпіянат Еўропы — адцягнула ўвагу ад усіх астатніх спаборніцтваў, якія праходзілі гэтымі днямі ў свеце. *«Тая атмасфера, якая была на «Мінск-Арэне»... Мы заслужылі, мы даказалі, што мы можам прыняць чэмпіянат свету тут»*, — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падзякаваў Міжнароднаму саюзу канькабежцаў за давер. *«Я чую ацэнкі, яны станоўчыя. Гэта яшчэ раз пацвярджае, што мы здольныя на большае. І калі вы вырашыце прыехаць сюды з большым, я вам абяцаю, што вы не пашкадуеце»*, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на працу суддзяў, якія, па яго словах, *«не забілі ўнутраны нерв гэтага спаборніцтва. Мы бачылі перажыванні, трагедыі, узнясенні вялікіх спартсменаў, якія прысвяцілі сваё жыццё гэтаму вялікаму віду спорту»*.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў трэнерам і запрасіў спартсменам і заклікаў часцей прыязджаць у Беларусь.

Чэмпіянат Еўропы па фігурным катанні ў Мінску атрымаў станоўчую ацэнку і ад **першага віцэ-прэзідэнта Міжнароднага саюза канькабежцаў (ISU) Аляксандра ЛАКЕРНІКА**.

— *«Мінск-Арэна» — прыгожае збудаванне, роўнага якому няма ў Еўропе, а можа быць, і ў свеце. Прыемна было бачыць поўныя залы на мерапрыемствах чэмпіянату — гэта, напэўна, паўплывае на папулярнасць фігурнага катання ў Беларусі. Чэмпіянат прайшоў паспяхова і з арганізацыйнага пункту гледжання. Вядома, нейкія невялікія накладкі былі, але гэта пытанне некаторага недахопу вопыту і моцна на агульную карціну не ўплывае. Думаю, гэты турнір павінен стаць штуршком для развіцця фігурнага катання ў Беларусі. Са спартыўнага пункту гледжання мы атрымалі некаторыя нечаканыя вынікі, але, напэўна, тым і добры спорт, што немагчыма загадзя прадказаць, хто выйграе.*

Турнір у Мінску — ужо гісторыя і яркая старонка ўспамінаў не толькі для нас, але і для сусветных зорак фігурнага катання. Іспанец Хаўер Фернандэс заваяваў тут свой сёмы тытул чэмпіёна Еўропы і завяршыў кар'еру. Ванэса Джэймс і Морган Сіпрэ менавіта на мінскім лёдзе ўпершыню з 1932 года выйгралі «золата» для Францыі ў парным катанні. Гіём Сізерон і Габрыэла Пападакіс сталі ў Беларусі пяціразовымі чэмпіёнамі Еўропы.

**Надзея АНІСОВІЧ, Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Армія Венесуэлы падтрымала Мадура



Дзярждэпартамент адклікаў частку дыпламатычнага корпуса з Венесуэлы і заклікаў амерыканцаў, якія знаходзяцца там, «сур'ёзна задумацца» аб ад'ездзе, паведаміла RT са спасылкай на The Guardian. На думку выдання, гэтае рашэнне было прынята Вашынгтонам пасля таго, як узброеныя сілы лацінаамерыканскай краіны прысягнулі на вернасць дзейнаму прэзідэнту Нікаласу Мадура. Спачатку амерыканскія ўлады праігнаравалі ўказ венесуэльскага ўрада аб выдварэнні супрацоўнікаў пасольства. Але пасля Дзярждэпартамент загадаў часткі дыпламатычнага корпуса пакінуць краіну. Напярэдадні міністр абароны Венесуэлы Уладзімір Падрына абвінаваціў апазіцыю, якую ўзначальвае Хуан Гуайдо, ЗША і іх рэгіянальных саюзнікаў, уключаючы Бразілію, у спробе здзейсніць дзяржпераварот, які пагражае ўвесці краіну ў «хаос і анархію». «Мы знаходзімся тут, каб пазбегнуць канфлікту паміж венесуэльцамі любой цаной. Грамадзянская вайна, братазабойчая вайна не вырашыць праблемы Венесуэлы. Патрэбен дыялог», — заявіў Падрына, выступаючы перад высокапастаўленымі вайскоўцамі.

## Страты эканомікі ЗША з-за шатдаўна склалі каля 6 мільярдаў долараў

Гэта вынікае з апублікаваных даных S&P Global Ratings. «Хоць гэты шатдаўн скончыўся, невялікае пагадненне на Капіталійскім узгорку, хутчэй за ўсё, адаб'ецца на ўпэўненасці бізнесу і настроях на фінансавых рынках», — адзначаецца ў прэс-рэлізе S&P. Як вядома, днямі прэзідэнт ЗША нечакана саступіў дэмакратам у кангрэсе і пагадзіўся падпісаць часовы бюджэт на тры тыдні, спыніўшы рэкордны па працягласці 35-дзённы шатдаўн — часовае спыненне работы федэральных ведамстваў з-за адсутнасці фінансавання. Трамп не атрымаў таго, што патрабаваў, — 5,7 мільярда долараў на памежную бяспеку і будаўніцтва сцяны на мяжы з Мексікай, але паабяцаў «працяг вясёлосці», калі за гэтыя тры тыдні дэмакраты не пойдуць на кампраміс.

## Эксперты прапанавалі задумацца аб масавым пераходзе на 4-дзённы працоўны тыдзень

У ходзе Сусветнага эканамічнага форуму (СЭФ) у Даvосе аўтарытэтныя эксперты прапанавалі задумацца аб масавым пераходзе на 4-дзённы працоўны тыдзень, адзначыўшы, што зніжэнне колькасці рабочых дзён пойдзе на карысць і кампаніям, і іх супрацоўнікам, перадае «Інтэрфакс». «Думаю, у нас ёсць добрыя эксперыменты, якія дэманструюць, што пры зніжэнні працягласці працоўнага часу людзі могуць больш эфектыўна засяродзіць увагу, іх выпрацоўка застаецца такой жа, пры гэтым якасць і крэатыўнасць часцяком узрастаюць. І яны больш лаяльныя да арганізацый, якія гатовыя быць гнуткімі адносна іх жыцця па-за працай», — заявіў у ходзе форуму псіхолаг Уортанскай школы бізнесу пры Пенсільванскім універсітэце Адам Грант. Яго падтрымаў эканаміст і гісторык Рутгер Брэгман, які нагадаў, што вядучыя розумы — эканамісты, сацыёлагі, філосафы — дзесяцігоддзямі верылі, што з часам чалавецтва зможа працаваць усё менш і менш. Сітуацыя змянілася толькі ў 70-я гады мінулага стагоддзя. «Прадпрымальнікі-капіталісты яшчэ ў 1920-я і 1930-я гады выявілі станоўчы ўплыў скарочанага працоўнага тыдня на прадукцыйнасць. Напрыклад, Генры Форд убачыў, што пасля пераходу ад 60-гадзіннага да 40-гадзіннага працоўнага тыдня яго рабочыя сталі больш прадукцыйнымі, паколькі менш стамляліся», — заўважыў эксперт.

Нашы дзеці

# «Калядная зорка» асвятляе дарогу

**Бясконцасць фантазіі, творчая ўнікальнасць і непаўторнасць, вынаходства новага ва ўжо вывучаным і сардэчная цеплыня. Так выказваюцца пра работы юных майстроў, удзельнікаў 22-й рэспубліканскай выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладной творчасці навучэнцаў «Калядная зорка».**



75 найлепшых творцаў з усёй краіны атрымалі на выхадных узнагароды і на адзін вечар акунуліся ў атмасферу калядных свят і цудаў. Кожны павёз дадому сімвалічную калядную зорачку-медаль і буклет з выявамі найлепшых конкурсных работ, на якія цягам двух месяцаў дзівіліся наведвальнікі Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі ў Мінску.

— Гэтая выстаўка — самая любімая ў дзяцей па колькасці работ, тэматыцы, зацікаўленасці. Штогод вы становіцеся ўсё больш вынаходлівымі. Здаецца, ужо ўсе тэхнікі вядомыя і знаёмыя, але вы падаеце гэта ў новым арыгінальным бачанні, — падзякавала юным творцам **дырэктар Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Надзея ВАСІЛЬЧАНКА**, уручаючы ўзнагароды.

Выбіраючы найлепшых, суддзі нават памаладзелі на 20 гадоў, падзялілася сакрэтам **Маргарыта ШЧАМЯЛЁВА, старшыня журы конкурсу**, віншуючы пераможцаў калядных намінацый:



— Мы атрымалі асалоду, адбіраючы найлепшыя работы. Сёлета іх велізарная колькасць. Хачу падзякаваць педагогам, якія займаюцца з малымі, вывучаючы народныя традыцыі. І пры гэтым не проста пераносяць іх у сучаснасць, а інтэрпрэтуюць, ствараюць новыя яркія вобразы. Гэта сапраўдныя, шчырыя работы з душой, праз якія перадаюцца любоў да свайго народа і веданне сваіх нацыянальных традыцый і каларыту.

**Ірына СІДАРОК.**

**Фота Андрэя САЗОНАВА.**

Фінансы

# ЗАЛАТЫ ЗАПАС КРАІНЫ ВЫРАС ЗА ГОД НА 1 ТОНУ

**Такім чынам, паводле інфармацыі Нацыянальнага банка, на 1 студзеня 2019 года залаты запас склаў 41,2 тоны.**

«Наяўнасць залатога запасу падтрымлівае давер рэзідэнтаў і нерэзідэнтаў Беларусі да здольнасці Нацыянальнага банка і ўрада выконваць свае фінансавыя абавязацельствы і праводзіць манетарную палітыку», — гаворыцца ў паведамленні, якое знаходзіцца на сайце Нацбанка. Таксама каштоўныя металы могуць быць выкарыстаны пры неабходнасці шляхам іх продажу, абмену або выкарыстання ў разліках.

Залаты запас — гэта каштоўныя металы ў выглядзе банкаўскіх зліткаў, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні Нацбанка і з'яўляюцца часткай Дзяржаўнага фонду каштоўных металаў і каштоўных камянёў Беларусі. Каштоўнасці залатога запасу захоўваюцца ў Цэнтральным сховішчы Нацыянальнага банка і размяшчаюцца на рахунках і ў дэпазітах за мяжой.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Дабрачынны праект

# ПАГЛЯДЗЕЦЬ У ДЗІЦЯЧЫЯ ВОЧЫ

## Больш чым траціна сельскіх школьнікаў маюць праблемы са зрокам

**У Брэсцкай вобласці падвялі вынікі дабрачыннага праекта па выяўленні захворванняў зроку ў сельскіх школьнікаў. Ён праходзіў летась у васьмі раёнах Брэстчыны. Ажыццяўляюць праект Беларускі дзіцячы фонд і кампанія velcom разам з аблвыканкамамі. У 2016—2017 гадах добрую справу рабілі ў Магілёўскай і Гомельскай абласцях, а летась прыехалі ў Брэсцкую.**




Ірына ЧАРНЯКОВА атрымлівае сімвалічны сертыфікат на працяг праекта ў Віцебскай вобласці.

### Неадкладная шпіталізацыя

Вучань восьмага класа адной са школ Камянецкага раёна прыйшоў у той дзень на заняткі як звычайна. На сценах віселі плакаты аб дабрачыннай акцыі «Я бачу»: у школу прыехалі дактары з Брэста, правяралі зрок у дзяцей. Хлопец з ранняга дзяцінства меў аслаблены зрок, у яго была яўная касавокасць, але лячэннем нхто не займаўся. Доктар Хрысціна Бялянічава была катэгарычнай: неадкладная шпіталізацыя ў абласную дзіцячую бальніцу і тэрміновае лячэнне. Пасля першага курса тэрапіі ў аддзяленні намеціліся змены да лепшага, школьнік стаў лепш бачыць. Другі курс лячэння прызначаны на канец вясны — пачатак лета.

Дзяцей, якіх пасля агляду ўрачоў адразу накіравалі на лячэнне, аказалася два дзясяткі, яшчэ 15 хлопчыкам і дзяўчаткам правялі аперацыю на вачах. Дадатковыя абследаванні ў спецыялізаваных установах прайшлі 82 чалавекі, 1380 атрымалі рэцэпты на акуляры.

**Сутнасць праекта заключаецца ў тым, каб дапамагчы спецыялістам заехаць у глыбінку і выявіць захворванні зроку ў дзяцей на ранніх стадыях, калі трэба, пралячыць малых пацыентаў, астатнім выдаць рэкамендацыі. Вядомы мабільны аператар выступіў у названай справе спонсарам. Было закуплена абсталяванне для дыягностыкі, падрыхтаваны адпаведны транспарт, арганізавана работа мабільных брыгад медыкаў. Афтальмолагі прыязджалі ў сельскую школу і аглядалі ўсіх яе вучняў. Такім чынам дзве мабільныя брыгады наведалі 135 школ і агледзелі 11 651 дзіця.**

### Прыём у глыбінцы

**Намеснік дырэктара Беларускага дзіцячага фонду Ірына ЧАРНЯКОВА** падкрэсліла асаблівую важнасць выязных урачэбных прыёмаў менавіта ў глыбінцы. Зразумела, што не ўсе бацькі з кожнай, нават аддаленай, вёскі маюць жаданне альбо магчымасць прывезці дзіця ў райцэнтр да спецыяліста на прафілактычны агляд. Можа здарыцца, што час, пазначаны ў талоне, супадзе з рабочым часам бацькі альбо маці. Тады паўстае патрэба адпрасіцца з работы, атрымаць адгул, што таксама не надта зручна. Многія разважаюць так: дзіця не скардзіцца — навошта лішні раз клапаціцца? Але ж у тым і справа, каб не ўпусціць час. Дастаткова сказаць, што ў 38,4 працэнта агледжаных школьнікаў выяўлены розныя паталогіі зроку. А ў 63 працэнтаў ад гэтага ліку парушэнні дыягнаставаны ўпершыню. Так што каэфіцыент карыснага дзеяння праекта даволі высокі. І нездарма брыгады праехалі па дарогах вобласці 22 630 кіламетраў!

— Такім чынам у Бярозаўскім, Ганцавіцкім, Маларыцкім, Жабінкаўскім, Камянецкім, Кобрынскім, Пружанскім, Ляхавіцкім раёнах афтальмалагічная дапамога дзецям стала больш даступнай, — канстатаваў **начальнік галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Брэсцкага аблвыканкама Віктар МІХАЛОЎСКІ.**

### Ешце, дзеці, вітаміны!

Падчас аглядаў у школах кожнае дзіця атрымала памятку аб прафілактычнай гімнастыцы для зроку, комплексе практыкаванняў для вачэй. Гэтую наглядную агітацыю давалі і дарослым. Летась інфармацыйная кампанія закранула тэму ўзаемасувязі правільнага харчавання і добрага зроку. У кожнай памятцы было ўказана, якое значэнне маюць прадукты з наяўнасцю вітаміну $B_2$ (малако, кефір, сыр, поснае мяса, печонка, сэрца) і вітаміну А (ёсць у масле, яечных жаўтках, рыбнай пячонцы), як неабходныя дзецям морква, іншая агароднiна і зеляніна, чарніцы, кукуруза, апельсіны. Важна напамінаць аб паўнацэнным харчаванні, калі вялікая частка грамадства прызвычаілася да газіровак, фаст-фуду ды іншай нездаровай ежы. Нават калі адзін з дзясятка тых, хто атрымаў лісток ці звярнуў увагу на маляўнічы білборд, задумаецца, ужо будзе добра.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Надвор'е

# Мокры снег з дажджом і каля нуля

## Да канца тыдня чакаецца на 5—7 градусаў вышэй за кліматычную норму

**У апошнія дні студзеня ўмовы надвор'я на тэрыторыі краіны будуць вызначаць атмасферныя франты і цёплыя паветраныя масы, якія паступаюць з паўднёвага захаду Еўропы.**

На змену маразам ідзе пацяпленне, і ў пачатку лютага ўжо ўсталюецца адліга з ападкамі. Тэмпературны фон будзе павышацца і ў канцы тыдня акажацца істотна вышэй за кліматычную норму, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У чацвер чарговая сістэма франтоў прынясе новую порцыю цяпла і выкліча на большай частцы тэрыторыі краіны мокры снег з дажджом. Месцамі чакаецца туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 6 градусаў па паўночным захадзе да плюс 1 градуса па паўднёвым усходзе, днём будзе ад мінус 3 градусаў да 3 цяпла.

Не абыдзецца без кароткачасовых ападкаў і пятніца. У першы дзень лютага на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуецца дождж, месцамі з мокрым снегам. У асобных раёнах чакаюцца туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла, удзень — ад мінус 2 да плюс 3 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у гэтыя выхадныя дні чакаецца сапраўды цёплае з ападкамі надвор'е. Магчыма, на наступным тыдні яно перарасце ў адлігу.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# КАЛІ ПЛАЧУЦЬ СВЕЧКІ...

## У Мінску ўшанавалі памяць ахвяр Халакосту

**У Мінску прайшоў шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных Міжнароднаму дню памяці ахвяр Халакосту.**



На іх прысутнічалі прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, дыпламатычных місій, розных канфесій, а таксама былыя вязні і сведкі жахлівых падзей, якія адбываліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Пачалося ўсё з запальвання свечак у Рэлігійным аб'яднанні абшчын прагрэсіўнага іўдаізму. Кожная з шасці свечак нагадвала пра 6 мільёнаў яўрэяў, якія былі знішчаны падчас Халакосту (паўтара мільёна з іх — дзеці).

Пасля ўдзельнікі мерапрыемстваў наведалі мемарыял на вуліцы Сухой, прысвечаны ахвярам Мінскага гета, і выстаўку Яд-Вашэм «Па наказе сэрца — Аспекты выратавання на акупаваных савецкіх тэрыторыях у гады Халакосту».

На Беларусі загінула ад 700 да 800 тысяч яўрэяў, больш за 100 тысяч з іх — у Мінскім гета. Таксама на нашай тэрыторыі было знішчана 25 тысяч заходнееўрапейскіх яўрэяў. Да гэтага часу вядуцца пошукі сведак, не заканчваюцца спробы аднавіць імёны і лёсы канкрэтных людзей. У адным з будынкаў на тэрыторыі былога гета, дзе падчас вайны хаваліся людзі, сёння працуе грамадскі музей — «Гістарычная майстэрня», у якім і адкрылася названая выстаўка.

Некаторыя школы актыўна супрацоўнічаюць з «Гістарычнай майстэрняй». На яе базе праводзяцца дыдактычныя і метадычныя заняткі для настаўнікаў, дзе падказваюць, якім чынам працаваць з тэмай Халакосту, рыхтуюцца выданні, якія расказваюць гісторыі вязняў канцлагераў, гета і ўсходніх рабочых. Так, некалькі месяцаў таму быў падрыхтаваны метадычны дапаможнік па гісторыі Мінскага гета, электронны варыянт якога размешчаны на партале Мінадукацыі, і кожны педагог мае магчымасць выкарыстоўваць гэтыя матэрыялы ў навучальным працэсе.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

На слыху

# ЗВЕР У ГОРАДЗЕ

## На Стаўбцоўшчыне хворы на шаленства воўк напаў на людзей. Пацярпелі чатыры чалавекі

**Першыя звесткі аб нападзенні дзікага звера, магчыма ваўка, паступілі ў міліцыю 26 студзеня ў 22.55. Як расказаў «Звяздзе» намеснік начальніка Стаўбцоўскага РАУС па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні маёр міліцыі Уладзімір КУДРЭВІЧ, у вёсцы Слабада, што знаходзіцца недалёка ад Стоўбцаў, драпежнік параніў мужчыну, а затым яго аднасяльчанку. Дзякуючы мясцовым жыхарам ваўка атрымалася адагнаць віламі. Каб разабрацца ў сітуацыі, на месца выехаў нарад міліцыі.**



Але на гэтым падарожжа драпежніка не скончылася. Праз некаторы час зноў паступіла інфармацыя: каля прыпынку «Акінчыцы» воўк напаў на маладую пару, а затым рушыў у напрамку Стоўбцаў. У райцэнтры агрэсіўнага драпежніка, які кідаўся на аўтамабіль, заўважыў мясцовы жыхар і паведаміў пра гэта ў міліцыю. Для абясшкоджвання на вуліцу 17 верасня выехаў нарад Дэпартамента аховы і два экіпажы ДАІ.

Ваўка заўважылі на ўскраіне горада. Міліцыянеры некалькі разоў стрэлілі па ім, але толькі паранілі. Звер выбег на поле, а потым схаваўся ў лясным масіве непадалёку. Там міліцэйскія нарады заблакавалі яго, а потым з дапамогай паляўнічага з цеплавізарам ён быў забіты. Пагоня за драпежнікам працягвалася да чатырох гадзін раніцы.

Пацярпелыя — дзве жанчыны і два мужчыны — былі накіраваныя ў Стаўбцоўскую цэнтральную раённую бальніцу. Высветлілася, што на іх напала ваўчыца, якой было каля трох гадоў. Спецыялісты Стаўбцоўскай раённай ветэрынарнай станцыі правялі аналізы і высветлілі, што драпежніца была хворая на шаленства. Дыягназ пацвердзілі і ў Мінскай абласной ветэрынарнай лабараторыі.

**Як адзначыў навуковы супрацоўнік лабараторыі папуляцыйнай экалогіі наземных пазваночных і кіравання біярэсурсамі НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах Павел ВЕЛІГУРАЎ, здаровы воўк звычайна не нападае на людзей. Выключэнне могуць складаць сітуацыі, калі звер ахоўвае вывадак. Але пры гэтым ён баіцца чалавека і не заходзіць у населеныя пункты. Пры захворванні ж на шаленства гэта боязь знікае. Таму калі воўк усё ж напаў — значыць, з вялікай доляй імавернасці, ён хворы.**

**Напасці на чалавека могуць таксама і гібрыды ваўка і сабакі — так званыя ваўкасобы, — але звычайна яны так агрэсіўна сябе не паводзяць.**

**Вядучы ветэрынарны ўрач Стаўбцоўскай раённай ветэрынарнай станцыі Марыя КАСПЯРОВІЧ** расказала, што выпадкі шаленства сярод ваўкоў у рэгіёне не рэгістраваліся ўжо каля дваццаці гадоў:

— Каб прадухіліць магчымае захворванне людзей і свойскіх жывёл, на два населеных пункты — Слабаду і Стоўбцы — накладзены двухмесячны каранцін. Праводзіцца падваровы абыход і растлумачальная работа з насельніцтвам, выяўляюцца і адлоўліваюцца падазроныя і бадзяжныя жывёлы. На ўсіх месцах, якія актыўна наведваюць жыхары, размешчаны памяткі пра небяспеку, якую нясе шаленства, і правілы паводзін у такіх сітуацыях.

Акрамя таго, спецыялісты заклікаюць жыхароў райцэнтра і Слабады вакцынаваць сваіх катоў і сабак. Каб людзі змаглі хутка гэта зрабіць, быў нават падоўжаны час работы гарадской ветклінікі.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

Шок

# МАЦІ ЗАДУШЫЛА 8-ГАДОВАГА СЫНА

**Гэты жудасны выпадак адбыўся ў Маладзечне. Па факце здарэння заведзена крымінальная справа.**

Па інфармацыі афіцыйнага прадстаўніка УСК па Мінскай вобласці Таццяны Беланог, вечарам у міліцыю патэлефанавала жыхарка Маладзечна і сказала, што яна задушыла свайго малога сына. На месцы інфармацыя пацвердзілася. Па падазрэнні ў забойстве затрыманая 29-гадовая маці дзіцяці. У сувязі з прыкметамі псіхічнага расстройства яна змешчана ў медыцынскую ўстанову, дзе выстаўлены пост аховы. Згодна з папярэдняй інфармацыяй, падазраваная выхоўвала сына адна і пражывала ў кватэры са сваімі роднымі. Ніхто з членаў сям'і на ўліках не стаяў, да крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці не прыцягваўся. Сям'я не была ў ліку тых, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы.

Зараз дапытваюцца родныя, суседзі, прызначаны шэраг экспертыз. Міліцыянеры ўстанаўліваюць матыў, абставіны і ўсе магчымыя фактары, што сталі прычынай здарэння. Ход расследавання крымінальнай справы знаходзіцца на асабістым кантролі кіраўніцтва УСК па Мінскай вобласці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Парламенцкі дзённік

# ПРАВА НА БЯСПЕКУ НА РАБОЧЫМ МЕСЦЫ

## У Палаце прадстаўнікоў адбылася прэзентацыя змяненняў у Закон «Аб ахове працы»

**Згодна са статыстыкай цягам апошніх гадоў колькасць няшчасных выпадкаў на вытворчасці зніжаецца. Тым не менш, па аператыўных даных Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы, у 2018 годзе ў краіне на вытворчасці загінула 149 работнікаў, з якіх 24 чалавекі ў момант атрымання траўмы знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення. Гэта сведчыць пра тое, што тэма аховы працы застаецца актуальнай. Да таго ж апошняя карэкціроўка адпаведнага закона праводзілася шэсць гадоў таму. Цяпер прапануецца змяніць 34 артыкулы з 44. Законапраект паступіў у ніжнюю палату парламента напрыканцы мінулага года.**

«Змяненні не носяць канцэптуальнага характару, у большасці яны карэктуюць паняційны апарат, дадаюць шэраг новых паняццяў, — пракаментавала дакумент **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях і кіраўнік рабочай групы па разглядзе згаданага законапраекта Людміла КАНАНОВІЧ.** — Пры гэтым тры новыя артыкулы вельмі важныя. Адзін з іх датычыцца дзяржаўнай экспертызы ўмоў працы. Ён рэгламентуе новы падыход: не столькі праверка, колькі вызначэнне адпаведнасці ўмоў працы, якую адносяць да небяспечнай. Яшчэ два вельмі важныя артыкулы датычацца аховы працы работнікаў, якія працуюць дома. Гэта абумоўлена змяненнямі ў Працоўным кодэксе, дзе дадаецца новы раздзел, які будзе рэгламентаваць працу тых, хто выконвае работу дыстанцыйна».

**Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Ігар СТАРАВОЙТАЎ** растлумачыў парламентарыям, што да неабходнасці ўнесіць пэўныя змяненні ў закон падштурхнулі два асноўныя дакументы: Указ 2015 года, якім унесены змяненні ў Дырэктыву № 1 «Аб мерах па ўмацаванні грамадскай бяспекі і дысцыпліны» і кардынальныя змяненні ў 2017 годзе Указа № 510, якія датычыцца кантрольнай (наглядной) дзейнасці.

«У новай рэдакцыі Дырэктыва № 1 у значнай ступені павышае адказнасць службовых асоб, непасрэдна наймальнікаў за гарантаванне бяспекі сваіх работнікаў», — сказаў Ігар Старавойтаў.

Акцэнт нагляднай дзейнасці, згодна з законапраектам, змяшчаецца ў бок прафілактыкі. Кантроль за стварэннем бяспечных умоў працы ўскладаецца на кіраўніка арганізацыі. Распрацоўшчыкі законапраекта разлічваюць на тое, што і наймальнік, і самі работнікі павінны несці адказнасць на сваім прадпрыемстве за стварэнне такіх умоў і за выкананне неабходных патрабаванняў супрацоўнікамі.

Адна з прапанаваных нормаў дае права Міністэрству аховы здароўя і Міністэрству працы і сацыяльнай абароны насельніцтва распрацоўваць тыпавы пералік работ і прафесій, якія будуць адносіцца да небяспечных. Тыпавы пералік не з'яўляецца вычарпальным, і наймальнікі змогуць уносіць у яго змены з улікам спецыфікі работы свайго прадпрыемства.

«Законапраект выключае з абавязкаў наймальніка правядзенне пашпартызацыі санітарна-тэхнічнага стану ўмоў працы, але дадае шэраг новых функцый, — расказаў **начальнік упраўлення аховы і дзяржаўнай экспертызы ўмоў працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Іван КАРЧЭЎСКІ.** — У прыватнасці, дадае ў яго абавязкі прадастаўленне па запыце ўпаўнаважаных кантрольных і наглядных органаў неабходнай інфармацыі, якая датычыцца захавання заканадаўства па ахове працы». Цяпер такую інфармацыю наймальнік абавязаны даваць па запыце суда.

Аўтары законапраекта прапісалі норму, якая дзейнічае, але не заўсёды выконваецца: правядзенне папярэдніх медыцынскіх аглядаў выключна за кошт сродкаў наймальніка. «На практыцы здараецца, што будучы работнік аплачвае медыцынскі агляд, а наймальнік гэтыя выдаткі потым не кампенсуе. Аднак папярэдні медыцынскі агляд — гэта абарона наймальніка ад прыёму на работу чалавека, які потым можа пагоршыць сваё здароўе або стаць прычынай негатыўных наступстваў», — падкрэсліў Іван Карчэўскі.

Праект закона канкрэтызуе адказнасць за стан абсталявання, збудаванняў і будынкаў, якія выкарыстоўваюцца рознымі арганізацыямі. Напрыклад, сёння будаўнічая арганізацыя, якая арандуе на дзень-два будаўнічую вышку для правядзення рамонтных работ, павінна спачатку правесці яе тэхнічны агляд, які доўжыцца каля месяца. У праекце закона ўтрымліваецца норма пра тое, што пры эксплуатацыі абсталявання, збудаванняў і будынкаў за іх стан нясе адказнасць уласнік, калі іншае не ўсталявана адпаведным дагаворам.

Яшчэ адна змена датычыцца расследавання няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў. Законапраект устанаўлівае дасудовы парадак разгляду скаргаў работніка ў выпадку яго нязгоды з вынікамі расследавання або ў выпадку адмовы наймальніка ў правядзенні расследавання няшчаснага выпадку на вытворчасці. Дзеючая рэдакцыя Закона прадугледжвае толькі судовы разбор такіх пытанняў. Такім чынам у работніка з'явіцца выбар: звяртацца або ў інспекцыю працы, або ў суд.

Законапраект плануецца разгледзець у першым чытанні на вясновай сесіі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ДАПЛАТЫ МАМАМ І ПАЖЫЛЫМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Так, даплата да пенсіі беларусам, якім споўнілася 75 гадоў, будзе раўняцца 40,67 рубля. Тыя ж, хто дасягнуў 80 гадоў, атрымаюць даплату ў 54,23 рубля. Гэтыя грошы, па словах прадстаўнікоў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, — так званы бонус за доўгажыхарства.

Мінімальная пенсія па ўзросце складзе 54 рублі (25 % БПМ). Акрамя таго, асобам, якія атрымліваюць такую пенсію, яшчэ даплачваюць 20 % ад сярэдняй заработнай платы па краіне.

### ЯК ЗМЕНЯЦЦА ДЗІЦЯЧЫЯ ДАПАМОГІ

Аднаразовая дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, будзе раўняцца 216 рублям.

З 1 лютага паднімуцца і аднаразовыя дапамогі пры нараджэнні дзяцей. Так, за першынца маці атрымае 2169 рублёў, за другога і наступных дзяцей — 3036,6 рубля.

Таксама павялічваецца памер дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў. З 1 лютага яна складзе:

на першае дзіця — 362,46 рубля;
на другое і наступных — 414,24 рубля;
на дзіця-інваліда — 466,02 рубля.



У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны нагадалі, што ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2012 года «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» памеры дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў пераразлічваюцца ў сувязі з ростам сярэднямесячнай заработнай платы два разы на год: з 1 лютага і 1 жніўня.

Памер гэтай дапамогі складае 35 % ад сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў у рэспубліцы — на першае дзіця, 40 % — на другое і наступных і 45 % — на дзіця-інваліда незалежна ад чарговасці яго нараджэння.

Па даных Нацыянальнага статыстычнага камітэта, намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата ў краіне ў IV квартале 2018 года склала 1035,6 рубля і павялічылася ў параўнанні з II кварталам на 10,2 %.

Штомесячная дапамога сем'ям на дзяцей ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў у перыяд выхавання дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў цяпер складзе 108,45 рубля, ці 50 % БПМ.

Дапамогі сем'ям, якія даглядаюць дзяцей-інвалідаў да 18 гадоў, вырастуць таксама. Іх памер складзе:

— калі ў дзіцяці I і II ступень страты здароўя, — 216 рублёў;

— калі ў дзіцяці III і IV ступень страты здароўя, да спаўнення яму 3 гадоў, — 216 рублёў;

— калі ў дзіцяці III і IV ступень страты здароўя і пры гэтым яму споўнілася 3 гады, — 260 рублёў.

**Святлана БУСЬКО.**

Падзея

# Быў «Масква — Мінск», стаў «Дабрабыт»

## З'явіўся першы банк з беларускім словам у назве

**Адкрытае акцыянернае таварыства «Банк Масква — Мінск» перайменавана ў ААТ «Банк Дабрабыт». Пра гэта ўчора паведаміў старшыня праўлення банка Ігар Ліхагруд.**

Ён таксама ўдакладніў, што гэтае рашэнне прадугледжана пастановай праўлення Нацыянальнага банка Беларусі № 41. Пастанова ўступае ў сілу 28 студзеня гэтага года. «Банк Масква — Мінск» з'яўляецца значным гульцом на банкаўскім рынку краіны з пункту гледжання абслугоўвання карпаратыўнага бізнесу. У банку абслугоўваецца больш за 10 тысяч юрыдычных асоб. Банк таксама пастаянна ўваходзіць у топ-3 асноўных удзельнікаў таргоў на валютна-фондавай біржы. Галоўным уласнікам гэтай фінансавай установы з'яўляецца Нацыянальны банк.

Перайменаванне банка можа быць звязана з планамі па яго прыватызацыі. Раней Нацыянальны банк выказваў намер прадаць «Банк Масква — Мінск» у 2019 годзе. На набыццё актыву прэтэндуюць турэцкія і кітайскія банкі.

Пасля правядзення рэбрэндынгу цяпер гэта першы ў свеце банк з беларускім словам у назве. Новае імя і пазіцыянаванне накіраваны на пашырэнне аўдыторыі банка і выступаюць часткай яго перадпродажнай падрыхтоўкі. Сучасны брэнд звернуты да нацыянальнай тэматыкі. Лагатып адсылае да беларускай сімволікі і спалучае знакі «багацце» і «энергія», а слова «дабрабыт» азначае матэрыяльны дастатак.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Ведай нашых!

# З навуковай дакладнасцю

У Нацыянальнай акадэміі навук адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў конкурсу на самае яркае і папулярнае прадстаўленне дзейнасці беларускіх вучоных у сродках масавай інфармацыі за 2018 год. Сярод лаўрэатаў і наш калега, рэдактар аддзела газеты «Звязда» Міхаіл Кавалёў. Ён удастоіўся прэміі ў намінацыі «Найлепшая публікацыя» за цыкл актуальных інтэрв'ю і артыкулаў, якія датычыліся дасягненняў нашых навукоўцаў у сферах машынабудавання, беспілотнай авіяцыі, сувязі, медыцыны і іншых.

Дарэчы, конкурс праводзіўся дзявяты раз. На суд спецыяльнай камісіі паступіла 138 публікацый дзесяткаў аўтараў друкаваных і электронных СМІ, інтэрнэт-рэсурсаў. Пераможцы былі названы таксама ў намінацыях: «Найлепшы сюжэт (праграма) на радыё і тэлебачанні», «Найлепшая публікацыя ў навукова-папулярным выданні» і «Найлепшае прадстаўленне дасягненняў НАН у сетцы Інтэрнэт».

# ТЭЛЕВІЗАР ДОЙДЗЕ Ў КАНАДУ

**Будынак Галоўпаштамта ў Мінску — адзін з самых вядомых. Вось ужо амаль 64 гады касавы і пасылачны залы штодня прымаюць тысячы наведвальнікаў. Здавалася б, працэс адпрацаваны да ідэалу: прыйшоў чалавек, узяў талон па электроннай чарзе, адправіў пасылку або ліст, заплаціў грошы, атрымаў квітанцыю і пайшоў далей па сваіх справах. Але сёння мы зазірнём па той бок касавай стойкі...**

**Аператар Зінаіда НОВАК** вось ужо больш за 44 гады — з лістапада 1974-га — адпраўляе з самага вядомага сталічнага паштовага аддзялення лісты, пераводы, плацяжы, пасылкі, бандэролі, выплачвае пенсіі... За бездакорную працу яе шмат разоў узнагароджвалі граматамі, аб'яўлялі падзякі.


Анжэла МАЛЕЙКА прымае пасылку.

— На мой выбар прафесіі паўплывала тое, што ў 38-м аддзяленні сувязі ў Мінску працавала і цётка, і стрыечная сястра. Я прыязджала да іх, назірала, як яны працуюць. І мне спадабалася. Пасля заканчэння школы паступала ў педагагічны інстытут, але не прайшла па конкурсе. Ну, жыць за нешта трэба было, і я падалася ў паштальёны. Пяць гадоў насіла лісты і газеты. За гэты час скончыла тэхнікум, і мяне перавялі на пасаду аператара дадатковых паслуг. Канешне, разварот быў сур'ёзны — адна справа, калі ты пастаянна на свежым паветры, носіш пошту, і зусім другая, калі ты сядзіш увесь рабочы дзень у памяшканні. Але пасля прывыкла і перайшла на Галоўпаштамт.

Рабочы дзень Зінаіды Аўрамаўны доўжыцца 12 гадзін — з васьмі раніцы і да васьмі вечара. Графік — два дні рабочыя праз два выхадныя.

— Цяпер, у век усеагульнага інтэрнэту, мы адпраўляем шмат звычайных лістоў. Я заўжды прапаноўваю розныя варыянты, каб ліст да адрасата дайшоў як мага хутчэй. Цікава, што і аб'ём падпіскі на прэсу не змяншаецца. Праўда, афармляюць яе людзі больш сталага веку. Істотна адчуваецца блізкасць вакзала. Вось на навагоднія святы да нас прыходзіла шмат гасцей з Расіі. Замежнікі набываюць ахвотна паштоўкі, купляюць калекцыйныя маркі. Мы вельмі лёгка можам распазнаць, хто перад намі — турыст або мясцовы жыхар.

Велізарны працоўны досвед Зінаіды Аўрамаўны дазваляе ёй рыхтаваць стажораў, якія ўпершыню аказваюцца па той бок стойкі.

— Не адзін дзясятак чалавек навучыла я ўсім сакрэтам працы апаратара. Некаторыя нават дараслі да кіраўнічых пастоў. Але ўсе яны пачыналі менавіта тут, прымаючы плацяжы, адпраўленні, лісты...

— А калі параўноўваць цяперашнюю пошту з той, якая была ў 1970-я, то што змянілася?

— Ды практычна ўсё. Раней мы працавалі на велізарных механічных машынах «Ака». Зараз маленькія камп'ютары дазваляюць рабіць работу хутчэй і надзейней. Плацеж, які я адпраўляю праз АРІП, даходзіць літаральна за пару хвілін, як і паштовы перавод. Ліст, які адпраўлены першым класам сёння, заўтра чытае адрасат. Дарэчы, ва ўсіх аддзяленнях паштовай сувязі сёння ёсць магчымасць атрымліваць пенсіі незалежна ад месца жыхарства. Гэта паслуга карыстаецца велізарнай папулярнасцю. Напрыклад, не сакрэт, што на зіму дзеці, якія жывуць у буйным горадзе, часцяком забіраюць да сябе састарэлых бацькоў. Атрымліваць пенсію ў гэтым выпадку вельмі зручна.

**Анжэла МАЛЕЙКА** працуе на паштамце **адміністратарам пасылачнай залы.** Яна кансультуе кліентаў па тым, як правільна трэба пасылаць адпраўленні як па Беларусі, так і за межы краіны. За дзень у залу прыходзіць у сярэднім каля 600 чалавек.

— Прычым у навагоднія святы гэтая лічба была нашмат большай. Праз нашы рукі праходзяць дзясяткі тысяч пасылак, дробных пакетаў, бандэроляў... Самая папулярная паслуга — гэта дастаўка з дапамогай паскоранай пошты EMS. Мы дастаўляем адпраўленні па прынцыпе «сёння на заўтра» і «з рук у рукі».

Навагодняя плынь адпраўленняў сёлета аказалася вельмі магутнай. Аб'ёмы адпраўленняў выраслі ў 4 разы. Да таго ж пошта адсюль адпраўляецца 4 разы на дзень. На ноч не застаецца нічога. Але якія тут самыя напружаныя дні?

— Так склалася, што да нас часцей за ўсё прыходзяць па панядзелках і аўторках. Пасярэдзіне тыдня назіраецца некаторае зацішша. І з пятніцы да нядзелі ў нас зноў шмат наведвальнікаў. Прычым ёсць такая асаблівасць, што ў выхадныя ў нас больш адпраўленняў за мяжу.

Сутыкаюцца работнікі паштамта і з не вельмі стандартнымі адпраўленнямі.

— Быў выпадак напярэдадні Дня святога Валянціна. Малады чалавек прыйшоў у пасылачную залу з вялізным букетам руж. Ён расказаў, што яго дзяўчына жыве ў іншым горадзе. Хлопец хацеў даслаць ёй кветкі, але не ведаў, як гэта зрабіць. Мы вельмі беражна іх упакавалі і адправілі паскоранай дастаўкай. Пасля хлопец прыйшоў яшчэ раз і вельмі нам дзякаваў. А аднойчы перасылалі... пчол. Не, усе скрыні былі запакаваны так, каб ніводная пчала не прарвалася адтуль. Але на ўсякі выпадак мы прынялі ўсе меры перасцярогі. На днях пасылалі керамічную плітку, карціны, вазы... А дзесьці гады чатыры таму ад нас адправілі ў Канаду тэлевізар з вадкакрышталічным экранам! Адпраўнік тады вельмі перажываў, ці дойдзе тэхніка па той бок Атлантычнага акіяна. Мы яго пераканалі, што ўсё зробім найлепшым чынам. Тады мы ўкруцілі яго ў безліч слаёў плёнкі, паралону і адправілі службай EMS. Досвед абыходжання з падобнымі рэчамі ў нас ёсць — балазе мы адпраўляем шмат крохкіх сувеніраў. Праз дзён сем адпраўнік прыйшоў да нас і моцна дзякаваў, што тэлевізар дайшоў і працуе без праблем. Мы з гэтым кліентам пасля пасябравалі, і ён прыходзіў да нас з адпраўленнямі яшчэ не раз.


Касавая зала Галоўпаштамта.


Зінаіда НОВАК на працоўным месцы.

Анжэла Малейка працуе ў паштовай сферы 20 гадоў, палова гэтага стажу прыходзіцца на Мінскі галоўпаштамт. Што ж самае складанае пры зносінах з кліентамі?

— Маё правіла простае: я не цягну на работу праблемы і клопаты, якія здараюцца па-за яе межамі. Кліент пойдзе толькі туды, дзе яго сустракаюць усмешкай і добрым настроем.

У касавай зале зрок кожны раз спыняецца на тэрміналах самаабслугоўвання. Дзякуючы ім можна пасылаць заказны ліст да двух кілаграмаў. Але каля кас усё-такі народу збіраецца болей. Чаму так?

— Людзі пажылога веку пераважна жадаюць зносін з чалавекам, — кажа **намеснік начальніка па эксплуатацыі вытворчасці «Мінская пошта» Алена ПРАКАПЕНЯ.** — Для моладзі гэта ў нейкай ступені дэлегаванне адказнасці. Хоць вось мы здолелі зацікавіць маладых людзей посткросінгам. Што гэта такое? Вы рэгіструецеся на партале www.postcrossing.com і вам прыходзіць пералік адрасоў, куды трэба адправіць паштоўкі. Вялікай папулярнасцю карыстаюцца карткі з відамі Мінска. Такім чынам, гэта рэальная магчымасць пагутарыць з такімі ж аматарамі перапіскі з іншых краін. Электроннае тэкставае паведамленне ў месенджары — гэта адно, а фізічная, напісаная ад рукі паштоўка, — гэта зусім іншае.

На Галоўпаштамце перыядычна адбываюцца цікавыя акцыі. Адна з апошніх — Дзень ручнога ліста, які прайшоў 23 студзеня. На працягу двух гадзін кожны ахвотны мог даслаць звычайную паштоўку, напісаную ад рукі, бясплатна па Беларусі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

# З УЛІКАМ СУСВЕТНЫХ ТЭНДЭНЦЫЙ

**На днях у Мінскай вобласці адбылася значная падзея. Старшыня Мінаблвыканкама Анатоль Ісачанка ўручыў пасведчанні «Чалавек года Міншчыны» найлепшым працаўнікам і кіраўнікам прадпрыемстваў і арганізацый цэнтральнага рэгіёна. У ліку ўзнагароджаных і дырэктар Мінскага філіяла Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белпошта» Жанна ШАБЕКА.**




Як лічыць Жанна Васілеўна, у тым, што яна атрымала гэтае званне, — заслуга ўсяго калектыву. Не толькі апарату ўпраўлення Мінскага філіяла РУП «Белпошта», але і ўсіх рэгіянальных вузлоў і аддзяленняў паштовай сувязі.

— Толькі дзякуючы сумеснай рабоце ўсяго калектыву мы выконваем пастаўленыя перад намі задачы, дасягаем намечанага, — лічыць Жанна Шабека. — І «Чалавек года Міншчыны» — гэта становчая ацэнка органамі ўлады работы ўсяго калектыву.

Мінскі філіял сапраўды стабільна развіваецца ў адной звязцы з РУП «Белпошта», як частка буйнога прадпрыемства паштовай сувязі. З улікам сусветных тэндэнцый значная ўвага аддаецца ў першую чаргу электроннаму гандлю, па ацэнцы экспертаў у найбліжэйшы час чакаецца яго далейшы рост. А паколькі ніхто не прыдумаў, як даставіць па інтэрнэце прадмет, які чалавек хоча купіць, то сегмент работы пошты застаецца вельмі запатрабаваны. Узаемадзеянне з інтэрнэт-магазінамі, стварэнне ўмоў яго кліентам, каб яны змаглі заказаць, аплаціць і своечасова атрымаць пакупку — у гэтым і бачаць сваю найпершую задачу супрацоўнікі «Белпошты». Задаволеныя спажыўцы паслугі, задаволеныя і паштавікі.

Працуюць у Мінскім філіяле і над далейшым развіццём электронных паслуг. Гэтае структурнае падраздзяленне з'яўляецца ўдзельнікам пілотнага праекта па аказанні электронных і адміністрацыйных паслуг на базе інфраструктуры РУП «Белпошта». Праект праходзіць у гарадах Барань Віцебскай і Фаніпаль Мінскай абласцей. У ім удзельнічае аддзяленне паштовай сувязі «Фаніпаль-1» Дзяржынскага рэгіянальнага вузла паштовай сувязі.

— І мы мяркуем, што пасля рэалізацыі праекта пошта стане надзейным пасярэднікам ва ўзаемадзеянні паміж сельскім насельніцтвам і службай «Адно акно» па выкананні адміністрацыйных працэдур, — канстатуе Жанна Васілеўна. — Мы бачым сваю функцыю ў тым, каб вясковы жыхар, і не толькі, змог атрымаць любы дакумент, даведку непасрэдна, не выходзячы з дома. Яму не трэба ехаць у райцэнтр або сельвыканкам, усё неабходнае можна заказаць і атрымаць у паштальёна.

Паколькі ў Мінскай вобласці сельскага насельніцтва даволі шмат, то не страчвае сваёй значнасці і падпіска. Гэта вельмі важны кірунак работы паштавікоў. Гарадскія жыхары ў асноўным чэрпаюць інфармацыю ў інтэрнэце. А вось у сельскай мясцовасці існуе ўстойлівая традыцыя, калі друкаваную паслугу цэняць больш, чым электронную. І пошта ўсяляк гэтаму садзейнічае, прапагандуе далейшае развіццё друкаванага слова і падтрымлівае насельніцтва ў тым, што друкаванае слова найбольш важкае, больш выверанае і павінна быць заўсёды.

| | Дрэнныя дні | 14—18, 20—24 | 15—20, 22—26 | 14—18, 20—24 | 13—18, 20—24 | 12—16, 18—22 | 10—16, 17—22 | 10—14, 16—20 | 9—13, 15—19 | 8—13, 14—19 | 7—11, 13—17 | 7—11, 13—17 |
| Збор зеляніны, гародніны, ягад і садавіны для неадкладнага спажывання (смачнейшыя, сакавіцейшыя, духмянейшыя) | Найлепшыя дні | 16, 17, 24, 25 | 15, 16, 23, 24 | 13, 19—21 | 17, 18, 26 | 13—15, 23, 24 | 10—12, 20—22 | 8, 16—18 | 12, 13 | 10, 11, 19—21 | 6—8, 16, 17 | 4, 5, 13, 14 |
| Збор караняплодаў для неадкладнага ўжывання (смачнейшыя сакавіцейшыя) | Найлепшыя дні | 6—8 | 5—7 | 2, 3, 11, 12, 29, 30 | 1, 8—10, 27, 28 | 5, 6 | 3, 29—31 | 7, 26, 27 | 3. 4, 22—24, 30 | 1, 2, 29 | 24—26 | 3, 22, 23, 31 |
| Збор зеляніны, гародніны, ягад і садавіны для працяглага захоўвання (лепш захоўваюцца) | Найлепшыя дні | 27 | — | 4 | 1—3, 29, 30 | 25—27 | 31 | 28, 29 | 24—26 | 22, 23 | — | 24, 25 |
| Збор караняплодаў, за выключэннем бульбы, для працяглага захоўвання (лепш захоўваюцца) | Найлепшыя дні | 27 | — | 4 | 1—3, 29, 30 | 25—27 | 31 | 28, 29 | 24—26 | 22, 23 | — | 24, 25 |
| | Недапушчальныя дні | 20, 21 | 19 | 18,19 | 17 | 16,17 | 15 | 14 | 13, 14 | 12 | 12 | |
| Збор караняплодаў для вырошчвання насення | Найлепшыя дні | 20, 21 | 19 | 18, 19 | 17 | 16, 17 | 15 | 14 | 13, 14 | 12 | 12 | |
| Збор бульбы | Найлепшыя дні (самыя высокія смакавыя якасці і захаванасць) | 27 | — | 4 | 1—3, 29, 30 | 25—27 | 31 | 28, 29 | 24—26 | 22, 23 | — | 24, 25 |
| | Недапушчальныя дні (дрэнны смак, не захоўваецца) | 24, 25 | 23, 24 | 19—21 | 17, 18 | 13—15 | 10—12 | 7, 8 | 3, 4, 30 | 1, 2, 29 | 24, 25 | 22, 23 |
| Кансерваванне агародніны і садавіны, квашанне капусты | Найлепшыя дні (для кансервавання без тэрмаапрацоўкі) | 8, 11—13 | 5, 10—12 | 2, 3, 29, 30 | 1, 4, 26—28, 31 | 1, 2, 23, 24, 28, 29 | 20—22, 25, 26 | 16—18, 17—19 | 13, 18, 19 | 10, 11, 15, 15 | 6—8, 11—13 | 3—5, 8—10 |
| | Найлепшыя дні (для кансервавання з тэрмаапрацоўкай) | 4, 9, 10, 18 | 3—5, 9, 10, 17, 18, 30, 31 | 1, 4, 13—15, 26—28 | 1—3, 11, 12, 24, 25, 29, 30 | 7, 8, 20—22, 25—27 | 17—19, 22—24, 31 | 14, 19, 20, 28, 29 | 10—12, 15—17, 24—26 | 7—9, 12, 13, 22, 23 | 3—5, 8—10, 18, 19 | 1, 2, 6—8, 15, 16, 29, 30 |
| | Недапушчальныя дні | 5—7 | 7, 8 | 6, 7 | 6, 7 | 4, 5 | 3—5 | 2, 3 | 1, 30 | 29, 30 | 27, 28 | 27, 28 |
| Нарыхтоўка сокаў | Найлепшыя дні | 20—22 | 22—24 | 20—22 | 20—22 | 18—20 | 17—20 | 16—18 | 15—17 | 14—17 | 13—15 | 13—15 |
| Збор лекавых раслін (вечарам да выпадзення расы або раніцай, адразу як раса прасохне). | Найлепшыя дні для «вяршкоў»: лісце, кветкі, насенне, плады, сцёблы, кара | 19 | 20, 21 | 19 | 18, 19 | 17 | 16, 17 | 15 | 14 | 13, 14 | 12 | 12 |
| | Найлепшыя дні для «карэньчыкаў»: карані, карэнішчы, клубні | 4, 5 | 6 | 5 | 4, 5 | 3 | 2, 3 | 1, 30 | 28, 29 | 28 | 26 | 26 |

# Крадзеж з водарам кавы

**Расійскі дальнабойшчык не справіўся з кіраваннем на дарозе ў Докшыцкім раёне, у выніку чаго фура апынулася на баку, а з прычэпа выпалі ўпакоўкі з таварам.**

Міма, як паведамілі ў МУС, праязджалі два жыхары Бягомля. Зрабіўшы круг каля месца здарэння, яны вярнуліся дадому і пачалі думаць, што рабіць. Вывучыўшы план мясцовасці, мужчыны вырашылі, што змогуць незаўважна падкрасціся да аўтацягніка. Адзін з саўдзельнікаў валодаў пэўнымі ведамі ў паляўнічай справе і на словах даказаў, што без цяжкасцяў зможа незаўважаным падкрасціся куды трэба. Не спыніла зламыснікаў і тое, што паляўнічы ўжо меў судзімасць за браканьерства, а яго хаўруснік — за крадзяжы. Пакуль кіроўца ў кабіне чакаў дапамогі, мужчыны непрыкметна падкраліся да скрынак, у якіх знаходзілася кава, і пачалі пераносіць іх у свой аўтамабіль за некалькі соцень метраў. Агулам зладзюжкі змясцілі ў машыну 360 слоікаў на суму 1235 рублёў. Неўзабаве хаўруснікі былі затрыманы супрацоўнікамі міліцыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного аукциона

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 420/С-3731 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – техническое здание № 1) обшей площадью 352,0 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Круповский с/с, севернее д. Крупово

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 423684300055000010 площадью 1,8092 га (назначение – для обслуживания зданий и сооружений), расположенном по адресу: Лидский р-н, Круповский с/с севернее д. Крупово. На земельном участке расположены иные капитальный строения, не подлежащие реализации. Земельный участок является неделимым. Оформление прав на земельный участок будет осуществляться в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь

Начальная цена продажи – 11 664,38 руб. (одиннадцать тысяч шестьсот шестьдесят четыре рубля тридцать восемь копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 1 166 руб. (одна тысяча сто шестьдесят шесть рублей)

ЛОТ 2: капитальное строение, инв. № 420/С-3734 (назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – котельная № 2), обшей площадью 305,4 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Круповский с/с, севернее д. Крупово

Обременения со стороны третьих лиц: в виде аренды сроком по 20.12.2021 г.

Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый № 423684300055000010 площадью 1,8092 га (назначение – для обслуживания зданий и сооружений), расположенном по адресу: Лидский р-н, Круповский с/с, севернее д. Крупово. На земельном участке расположены иные капитальный строения, не подлежащие реализации. Земельный участок является неделимым. Оформление прав на земельный участок будет осуществляться в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

Начальная цена продажи – 10 132,69 руб. (десять тысяч сто тридцать два рубля шестьдесят девять копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 1 013 руб. (одна тысяча тринадцать рублей)

Продавец – ОАО «Лидахлебопродукт», 231300, г. Лида, ул. Булата, 1, тел. 8-0154-65-25-01, факс 8-0154-65-25-60

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – р/с BY44BLBB301205 00833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 12 февраля 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; физическим лицом – паспорт (документ его заменяющий) и его копия; юридическим лицом и ИП резидентами Республики Беларусь – заверенные копии учредительных документов; юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык

При подаче документов на участие в аукционе представителем, организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня

***Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 15.09.2018 г.***

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**
**Последний день приема заявлений – 7 февраля 2019 г. до 15.00**

*Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Дополнительная информация на http://grodnoino.by*



## Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29 |

**Предмет аукциона**

**Лот № 1. Квартира 2,** общ. пл. 74,3 кв. м, инв. №500/D-70591, по адресу: г. Минск, ул. Карла Маркса, 33-2. Начальная цена без НДС – 231 800,00 бел. руб.

**Лот №2. Квартира 12,** общ. пл. 67,8 кв. м, инв. №500/D-70611, по адресу: г. Минск, ул. Карла Маркса, 33-12. Начальная цена без НДС – 212 800,00 бел. руб.

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Срок заключения договора купли-продажи: 15 рабочих дней после проведения аукциона.**

**Ограничения (обременения) прав на недвижимое имущество,** установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия по Лотам № 1-2. Новый собственник материальной историко-культурной ценности обязан в течение тридцати календарных дней со дня приобретения права собственности подписать охранное обязательство. Невыполнение этого требования является основанием для признания сделки недействительной.

**Условия оплаты предмета аукциона:** победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее 20 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

Передача предмета аукциона победителю аукциона (единственному участнику аукциона), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости недвижимого имущества.

Победителю аукциона (единственному участнику аукциона), обратиться за государственной регистрацией перехода права собственности на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.

Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи.

При приобретении Лота № 1 победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи следующего имущества: водомер (счетчик горячей воды), инв. № 61692577) – 72,30 бел. руб. с НДС 20 %, водомер (счетчик холодной воды), инв. № 61692576) – 72,38 бел. руб. с НДС 20 %, кухонная плитка CEZARIS ПГ 2100-01 (инв. № 61692982) – 142,94 бел. руб. с НДС 20 %.

При приобретении Лота №2, победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи следующего имущества: счетчики учета воды (инв. №60004411) – 24,76 бел. руб. с НДС 20 %, счетчики учета воды (инв. № 60004412) – 24,76 бел. руб. с НДС 20 %, кухонная плитка CEZARIS ПГ 2100-01 (инв. №61692983) – 142,94 бел. руб. с НДС 20 %.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **06.03.2019 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **04.03.2019 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by** |



## Извещение о проведении 12 февраля 2019 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 7»

| Предмет торгов |
|---|
| «нежилой сборный домик» общей площадью 54,8 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 600/С-109697; «повышенный железнодорожный путь» протяженностью 240 м, инв. № в ЕГРНИ 600/С-146178; «сооружение артезианской скважины», инв. № в ЕГРНИ 600/С-102835; «цементный склад», инв. № в ЕГРНИ 600/С-102840 (составные части и принадлежности: цементный склад с навесом цементного склада с пристройкой а1, навесом цементного склада с шиферной крышей а2, ограждением а3); «цементобетонная площадка» общей площадью 1303 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 600/С-102842 (составные части и принадлежности: цементобетонная площадка с бетонной площадкой а1, ограждением а2);<br>воздухосборник В-10 М3 (инв. № 41077); воздухосборник В-10 М3 (инв. № 41078); лебедка ТЛ 8Б (инв. № 40769); пневмоподъемник ППВ-100 (инв. № 50616); пневмоподъемник ППВ-100 (инв. № 50615); пневмоподъемник ТА 15А (инв. № 50199) |
| Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Загородная, д. 1 |
| Сведения о земельных участках: площадь – 0,6577 га, кадастровый номер – 623650100001004285; площадь – 0,0984 га, кадастровый номер – 623650100001004286; площадь – 1,0226 га, кадастровый номер – 623650100001004287; площадь – 0,0024 га, кадастровый номер – 623650100001004546 |
| Начальная цена: 492 945,17 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 49 300,00 бел. руб. |
| Обременения: аренда, сервитут |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 7», 223021, Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырево, АБК, тел. (017) 507-61-83.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск, тел. (017) 327-05-62.

**Условия торгов:**

1. победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов;

2. сохранение победителем торгов (покупателем) сервитута при переходе прав на недвижимое имущество.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 7», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 12 февраля 2019 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 29.01.2019 по 11.02.2019 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 507-61-83 (ОАО «ДСТ № 7»)**



## ОАО «Барановичхлебопродукт» извещает о проведении открытого аукциона по продаже недвижимого имущества:

**Лот № 1 (повторный аукцион):** капитальное строение с инв. № 110/С-7499, адрес: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Притыцкого, 77, площадь 506,1 кв. м, целевое назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин. Составные части и принадлежности: кирпичная пристройка, рампа, три крыльца. Начальная цена продажи с НДС 20 % – 619 560,00 руб. Сумма задатка – 61 956,00 руб. Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 141000000005001551 площадью 0,0955 га, целевое назначение – для обслуживания здания магазина, имеется ограничение прав в использовании земли на площади 0,0029 га (проход, проезд к земельному участку постороннего землепользователя).

Часть магазина (7,05 кв. м) арендуется ОАО «АСБ Беларусбанк» (банкомат, обменный пункт валют).

В задании магазина находится имущество (торговое оборудование, роллеты на окна, и др.) как собственнику, так и учрежденному собственником унитарному предприятию (предыдущему арендатору основных площадей магазина). Стоимость данного имущества в стоимость лота не входит, его продажа может осуществляться по договоренности по отдельным договорам.

Характеристики лота 1: год постройки – 1979; фундамент – бетонный ленточный; стены и перегородки – кирпич; перекрытия – железобет. плиты; кровля – рулонная; полы – бетонные, плиточные; окна – стеклопакеты; двери – металлопластик, металл, дерево; отделка внутр. – оштукатурено, покрашено, оклеено обоями, облицовано плиткой; электричество, водопровод, канализация, отопление.

Аукцион по продаже лота 1 состоится 12.02.2019 в 14.00 Заявления на участие в аукционе принимаются не позднее 16.00 11.02.2019.

Извещение о ранее проведенном аукционе по лоту № 1 было размещено 12.12.2018 в газете «Звязда», на официальном сайте ОАО «Барановичхлебопродукт».

**Лот № 2 (повторный аукцион):** капитальное строение с инв. № 110/С-115618, адрес: Брестская обл., Барановичский р-н, Полонковский с/с, д. Ягодная, ул. Лесная, 77А, площадь 721,6 кв. м, целевое назначение – здание специализированное животноводства, наименование – здание телятника. Начальная цена продажи с НДС 20 % – 10 602,00 руб. (снижена на 5 %). Сумма задатка – 1060,20 руб. Лот № 2 расположен на земельном участке с кадастровым номером 120488005601000019, площадью 2,0139 га, целевое назначение – для обслуживания здания телятника.

Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель на площади 2,0139 га (охранная зона ЛЭП, охранная зона водных объектов).

Лот № 2 передан в аренду физическому лицу. Срок аренды до 31.07.2019.

Характеристики лота 1: год постройки – 1976; фундамент – бетон; наружн. стены – брус, столбы кирпичные; внутр. стены – брус; перегородки – доска, кирпичи; перекрытия – дерево; крыша – асбестоцементный волнистый лист; полы – бетон, плитка цементно-песчаная; окна – дерево; двери, ворота – дерево; отделка наружн. – нет, отделка внутр. – окрашено; вентиляция – естественная; электроснабж. – централиз. система; отопление, водоснабж., канализация – нет.

Аукцион по продаже лота 2 состоится 13.02.2019 в 14.00 Заявления на участие в аукционе принимаются не позднее 16.00 12.02.2019.

Извещение о ранее проведенном аукционе по лоту № 2 было размещено 09.11.2018 в газете «Звязда», на официальном сайте ОАО «Барановичхлебопродукт».

Продавец и организатор аукциона – открытое акционерное общество «Барановичский комбинат хлебопродуктов», Брестская обл., г. Барановичи, ул. 50 лет БССР, 21, тел./факс 8 (0163) 41-72-53. Место проведения аукционов: Брестская обл., г. Барановичи, ул. 50 лет БССР, 21, 2-й эт., актовый зал.

Порядок оформления участия в аукционе и его проведения определяется Гражданским кодексом Республики Беларусь, Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже отдельных объектов, находящихся в собственности ОАО «Барановичхлебопродукт».

Задаток в размере 10 % от начальной стоимости соответствующего лота перечисляется организатору аукциона на р/с BY28 BAPB 3012 2758 5001 1000 0000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, БИК: BAPBBY2X, УНП 201028602, получатель платежа – ОАО «Барановичхлебопродукт» (филиал «Оранчицкое ХПП»). Срок внесения задатка – до подачи заявления на участие в аукционе. Шаг аукциона: 5 % от начальной цены предмета аукциона.

Заявление на участие в аукционе и необходимые документы, в том числе документы, подтверждающие оплату задатка, принимаются по адресу: г. Барановичи, ул. 50 лет БССР, 21, каб. 17 (юридический отдел) в рабочие дни с 08.00 до 16.30.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан в течение 3 рабочих дней с даты проведения аукциона оплатить организатору аукциона сумму, в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона.

Договор купли-продажи с победителем аукциона (единственным участником аукциона) заключается в течение 30 календарных дней с даты проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона. Условие оплаты – в течение 5 рабочих дней с момента подписания договора. По соглашению сторон возможно предоставление рассрочки оплаты.

Организатор аукциона имеет право отказаться от его проведения в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до наступления даты проведения аукциона.

# «МАЁ ЖЫЦЦЁ — ГЭТА БЕГ З ПЕРАШКОДАМІ»



Фота Андрэя САЗОНАВА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У яе кватэры ў адной са «сталінак» у цэнтры Мінска ідэальная чысціня. Ніка Мікалаеўна любіць парадак і да нашага прыходу зрабіла ўборку пасля ўчарашніх гасцей.

— Да мяне прыходзіць сацыяльны работнік, але я стараюся яе не нагружаць. І ўсё жыццё рабіла ўсё сама. У нашай сям'і ніколі не было нянек, дзеншчыкоў. Лягчэй пералічыць тое, чаго я не ўмела, чым тое, чым прыходзілася займацца. Здаралася, сын з'язджае ў адпачынак, а я бяру памазок і падлогу ў кватэры пакрываю лакам. Я і вязала, шыла і перашывала рэчы, магла і боты падбіць дратвай. Не сядзела без справы на лаўцы нават у гарнізонах, усё жыццё працавала. У мяне 60 гадоў каляндарнага стажу, некаторыя, напэўна, скажуць: дурная бабка.

**— Кім былі вашы бацькі?**

— Я нарадзілася ў Заўраллі. Мама была педагогам малодшых класаў, працавала ў той час, калі ўкараняліся прынцыпы педагогікі Макаранкі. Была загадчыцай аднаго з дзіцячых дамоў пасля рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны, калі было шмат беспрытульнікаў. Мама казала, што тады дзеці былі іншыя — з пачуццём павагі, сяброўства, ніколі адзін у аднаго не кралі, а вось наступныя пакаленні былі ўжо іншыя. Мама адпрацавала 40 гадоў. Мой бацька скончыў Бауманаўскае вучылішча, як яно называлася пазней, а на той час гэта было Імператарскае маскоўскае тэхнічнае вучылішча. У мяне нават захаваўся яго студэнцкі білет, атэстат. Пасля працаваў інжынерам-землеўпарадчыкам. А ў 1938 годзе яго арыштавалі, абвінавацілі ў контррэвалюцыйнай дзейнасці і расстралялі. Праз шмат гадоў рэабілітавалі...

**— Вам, дачцэ ворага народа, прыходзілася няпроста?**

— Я вучылася ў школе на выдатна. Маму ўсе загадзя віншавалі з маім медалём, і на ўручэнне атэстатаў я ішла ў выдатным настроі. А назад ехала — і не было на свеце больш няшчаснай дзяўчынкі. Мне дадалі чацвёрак па геаграфіі, біялогіі і нават па рускай мове. Гэта зараз я стаўлюся з гумарам: ну не далі — нічога страшнага. А тады было так крыўдна... У камсамол я не ўступала — бо ведала, што мяне не прымуць. Таксама няпроста было з маім характарам: я ж не прапускала ніводнага адкрытага камсамольскага сходу. Дзякуй богу, не перашкаджалі паступаць у медыцынскі інстытут. Дарэчы, характар у мяне праявіўся з самага дзяцінства. Уявіце, у трэцім класе паспрачалася з настаўніцай на тэму правільнага напісання слова. Я даказвала сваё, а яна — сваё. Настолькі я пакрыўдзілася і вырашыла, што ў 4 класе ў яе вучыцца не буду. За лета экстэрнам здала экзамены — і пайшла ў пяты клас.

**«У мяне на той час не было ні кватэры, ні работы, ніводнага знаёмага ў горадзе, старэнькая свякроў, 11-гадовы сын і вялікі інфаркт».**

Калі тату арыштавалі, мы з мамай і бабуляй пераехалі ў Чэлябінск. Там жыла маміна сястра, таксама педагог. Мама яшчэ доўга ездзіла ў Свярдлоўск, ва ўпраўленне НКУС, дабівалася спаткання з бацькам, а яго, як пазней высветлілася, ужо не было ў жывых. Спачатку нам прыслалі паперку, што ў 42-м ён быццам бы памёр ад запалення лёгкіх. А потым мы даведаліся, што яго расстралялі 29 снежня 1938 года.

У 1945 годзе я скончыла школу і паступіла ў медінстытут. Заканчвала ардынатуру па неўралогіі, па спецыяльнасці я неўрапатолаг.

**— Не часта сустрэнеш чалавека з працоўным стажам у 60 гадоў...**

— Адразу пасля здачы дзяржэкзамену я выйшла на работу — не адпачывала і дня. Заўсёды падпрацоўвала — брала дзяжурствы, дадатковую палову стаўкі. Працавала і бясплатна — у гарнізон прыедзеш, добра, калі ёсць санчасць, а часам толькі медпункт, там вядзе прыём ваенны фельчар. Я садзілася і дапамагала. У Мінску 40 гадоў адпрацавала ў дыспансеры спартыўнай медыцыны. Маю званне ўдарніка камуністычнай працы. Былі ў мяне і цікавыя пасады, напрыклад, давераны ўрач Паўднёва-Уральскай чыгункі.

**— Як пазнаёміліся з Героем Савецкага Саюза Якавам Шышкіным, які потым стаў вашым мужам?**

— На рабоце мне далі пуцёўку ў санаторый у Сочы. У мяне ёсць адна асаблівасць: я лёгка знаёмлюся і «абрастаю» людзьмі імгненна. Пайшла на рынак, хаджу па радах. Бабуля прадае салёныя агуркі, мне так іх захацелася. І ў яго пытаю: будзеце агурок? Я і ведаць не ведала, хто гэта — ён жа не хадзіў у форме. Якаў здзівіўся і нават разгубіўся. Я купіла два агуркі, адным пачаставала яго. Пасля гэтага, напэўна, ён адразу і закахаўся. Мы перапісваліся, на наступны год і ён, і я зноў прыехалі ў Сочы. Такое вось у нас «агурковае» знаёмства.

**— Ведаю, што вы былі знаёмы з маршалам Ракасоўскім...**

— Я некалькі разоў гуляла з ім у валейбол — вось і ўсё наша знаёмства. Мы з мужам адпачывалі ў санаторыі. А мяне хлебам не кармі, дай пагуляць у валейбол. У нас там арганізавалася свая жаночая каманда. Ракасоўскі спыняецца аднойчы побач з пляцоўкай, дзе мы гулялі, заканчваецца партыя, і ён пытае: «Жанчыны, можна я з вамі пагуляю?» — «Канешне!» Ён быў разам з жонкай, яна невысокага росту, а ён мужчына відны, і ўсе мы былі крыху ў яго закаханыя. Адчувалася яго дваранскае паходжанне, інтэлігентнасць, розум, дасціпнасць — усё было пры ім.

**— Не ў кожным санаторыі, напэўна, можна было так проста пазнаёміцца з маршалам...**

— Гэта ж быў ваенны санаторый. Напрыклад, у ваенным санаторыі імя Фабрыцыуса ў Сочы мы перасякаліся з Юрыем Гагарыным. Часам нас вазілі ў кіно, дзе збіралася кіраўніцтва. Муж заўсёды садзіўся на канапу ў канцы залы, там яны з Гагарыным размаўлялі. А я ішла бліжэй да экрана. Калі фільм заканчваўся, я падыходзіла, мы віталіся. Ён быў надзвычай абаяльны і сціплы, да таго ж сапраўдны інтэлігент. Была я знаёмая і з касманаўтам Паўлам Паповічам. Яго жонка Марына Паповіч, лётчык-выпрабавальнік, мне вельмі падабалася. Неяк мы з мужам адпачывалі ў санаторыі імя Варашылава. Перад танцамі я на вуліцы чакала Якава. Ішоў дождж, а паколькі ў мяне быў плашч, я аддала свой парасон Паповічу. На танцпляцоўцы ён яшчэ запрасіў мяне на танец. На наступны дзень вяртаў нам парасон, і адчувалася, што ніяк не мог зразумець, чаму ў яго не просяць аўтограф. Слава робіць сваю справу, не ўсе праходзілі выпрабаванне меднымі трубамі.

**«Мама яшчэ доўга ездзіла ў Свярдлоўск, ва ўпраўленне НКУС, дабівалася спаткання з бацькам, а яго, як пазней высветлілася, ужо не было ў жывых».**

**— Вы сябравалі з сям'ёй сына Анастаса Мікаяна...**

— Так. Аляксей з жонкай і сынам (а ён, дарэчы, пазней стаў вядомы як Стас Намін, музыкант і рэжысёр) нават гасціў у нас з мужам. Мне на работу трэба і нязручна перад гасцямі. А Аляксей кажа: ідзіце, не хвалюйцеся. Вяртаюся з работы — абед гатовы. Тыдзень яны ў нас так гасцілі. А калі ад'язджалі, кажу: як шкада, я так добра ўладкавалася.

**— Як вы з мужам апынуліся ў Мінску?**

— Якаў служыў у розных пунктах Саюза, чатыры гады ў Германіі. Вярнуліся адтуль і сталі выбіраць горад. Я да гэтага ў Мінску ні разу не была. А Якаў аднойчы прыязджаў забіраць самалёт, горад яму спадабаўся. Так і пераехалі сюды ў 1966-м. А праз паўгода ў яго здарыўся цяжкі інфаркт. Пасля вайны ён асвойваў звышгукавыя самалёты. А на новай тэхніцы, здаралася, гінулі лётчыкі. Я сама ўвесь час жыла ў напружанні. У гарнізоне прыслухоўваюся: лятаюць, значыць, усё ў парадку. Потым чую: спыніліся начныя палёты. Я пачынаю нервавацца: чаму? Нехта разбіўся? На камандны пункт сорамна тэлефанаваць. Праз гадзіну аднаўляюцца палёты, ну дзякуй богу. Прыходзіць Якаў дадому, пытаю: «Чаму не было палётаў з гадзіны да без пятнаццаці дзвюх?» — «Чаму ж не было, здаецца, ляталі ўсю ноч... А, самалёт выкаціўся за паласу, пакуль вярталі, быў перапынак»... І вось толькі ён скончыў лятаць, як здарыўся цяжкі інфаркт. Я нанова вучыла яго хадзіць, гаварыць, пісаць. Гэта страшна, калі ведаеш чалавека моцным, валявым, разумным, а ён раптам ператвараецца ў бездапаможнае кураня. Пасля інфаркту Якаў тры з паловай месяцы знаходзіўся ў шпіталі, я штодзень яго наведвала. У мяне на той час не было ні кватэры, ні работы, ніводнага знаёмага ў горадзе, старэнькая свякроў, 11-гадовы сын і вялікі інфаркт.

**— Нават у герояў вайны былі праблемы з кватэрай?**

— Мы пераехалі ў Мінск і працяглы час жылі на часовай, чакалі, пакуль вызваляць гэтую кватэру: армейскага палітработніка пераводзілі ў Маскву. А жонка палітработніка не спяшалася выязджаць. Мне трэба рабіць рамонт, бо кватэра была ў жудасным стане, забіраць мужа са шпіталя, а ранейшыя жыльцы ніяк не з'едуць... У мяне ўсё жыццё — бег з перашкодамі. Уначы ідзеш са шпіталя, і маральна, і фізічна стомленая і думаеш: няхай бы мяне збіў грузавік, але толькі каб адразу... Потым разумееш: сыну 11 гадоў, старая свякроў, хворы муж — што яны будуць без мяне рабіць? Трэба жыць, нікуды не дзенешся...

Пасля інфаркту муж пражыў яшчэ 14 гадоў, а ў 51 я стала ўдавой. І хоць вакол заўсёды было шмат мужчын, я так і не сустрэла нікога падобнага на свайго мужа. Так і засталася адна. У 2009 годзе, калі была вялікая эпідэмія грыпу, я страціла адзінага сына. Ён заўсёды вёў здаровы лад жыцця — не ўжываў алкаголь, не курыў. Займаўся спортам, у прыватнасці альпінізмам, быў нават інструктарам. З дзяцінства Мікалай быў настолькі самастойны, ніколі не даставаў ніякіх клопатаў. Прыбягаеш са шпіталя, ён робіць урокі. Пытаеш: «Ты гуляў на вуліцы?» — «Не, трэба дарабіць урокі». Ён скончыў школу з залатым медалём, інстытут з чырвоным дыпломам. Абараняўся ў тэхнічнай ВНУ на англійскай мове, самастойна яе вывучыў... Прысвяціў сябе навуцы, выкладаў у тэхналагічным універсітэце. Шмат працаваў — да двух-трох гадзін ночы заседжваўся, вось і ўсе яго парушэнні рэжыму. І так на фоне поўнага здароўя ён памёр ад ускладнення грыпу. Гэта здарылася 29 снежня 2009-га. А муж памёр 25 снежня 1979 года. 29 снежня 1938 года расстралялі майго бацьку. Кожны год першую палову снежня я яшчэ трымаюся, а потым мяне пачынае трэсці... Я засталася зусім адна. У сына не было сям'і: як кажуць яго сябры, ён проста не сустрэў жанчыну, падобную на мяне.

**— Як вы перажылі смерць сына?**

— Сама не ведаю. У мяне нікога няма — ні ўнукаў, ні дзяцей, ні сясцёр, ні братоў. Але нельга дазваляць сабе азлобіцца. Да таго ж я стараюся ніколі не скардзіцца. Я і сама перанесла пяць сеансаў хіміятэрапіі. Раней нічым асабліва не хварэла, а калі пахавала Мікалая, на нервовай глебе пачалося адно за другім. А потым увогуле паставілі дыягназ рак горла. Уставілі трубку, праз якую трэба карміцца. І я самастойна дома паўтара месяца харчавалася праз гэту трубку. Сама рабіла перавязкі. Потым пачаліся сеансы хіміятэрапіі...

**— Што вам дапамагло? Жаданне справіцца з хваробай?**

— Калі шчыра, я і сёння не магу зразумець, навошта мяне Бог пакінуў на гэтым свеце. Але значыць, для чагосьці я тут патрэбна. Мае сяброўкі (ім за 50, бо равесніц маіх ужо не засталося амаль) тэлефануюць: там баліць, тут баліць. А я ніколі не скарджуся, карысці з гэтага ніякай.

Неяк пасля «хіміі» ляжу ў рэанімацыі, тэлефон мой забралі. А напярэдадні мае хлопцы- гандбалісты гулялі з Польшчай. Я ж павінна была ведаць, як сыгралі. Думаю, трэба спытаць у кагосьці. Раніцай абход, прыйшла галоўны ўрач з маладымі практыкантамі. У яе пытаць не рызыкнула: думаю, вырашыць, што звар'яцела бабка, і накіруе ў «Навінкі». Потым прыйшоў малады ўрач. Кажу: можна незвычайнае пытанне? Як сыграла зборная па гандболе? Ён пагледзеў у тэлефоне, нават лік памятаю — 31:30, нашы выйгралі!

**«Уявіце, у трэцім класе паспрачалася з настаўніцай на тэму правільнага напісання слова. Я даказвала сваё, а яна — сваё. Настолькі я пакрыўдзілася і вырашыла, што ў 4 класе ў яе вучыцца не буду».**

**— Нягледзячы на тое, што вам давялося перажыць, за што вы ўдзячны лёсу?**

— У мяне быў выдатны сын. І гэта падарунак, хоць яго ў мяне і забралі...

Зараз перыядычна адчуваю сябе не вельмі добра, але ўсім кажу, што гэта надвор'е ўплывае. Урачы зрабілі абследаванні, пытаю ў іх, ці трэба нейкія лекі прымаць? Кажуць, што не трэба. Я і сама разумею, што ў 90 гадоў нічога не зробіш — як ні круці, узрост. Але я кажу — надвор'е.

**Алена КРАВЕЦ.**

Ігуменскі тракт
№ 3 (225)

Слоўніца

# МОВА БАЦЬКОЎ ЗАСТАНЕЦЦА НА СТАГОДДЗІ...

**Існуе больш чым паўтары тысячы перакладаў Біблії на розныя мовы свету, і да іх дадаўся яшчэ адзін. Упершыню евангелісты загаварылі на мове палешукоў.**

«От як було́, як Ісу́с Хрысто́с роды'вся. По́сля зару́чын Ма́тыра Его́ Марі́йі з Ё'сыпом, пы'рыд тым, як воны' побрались, ста́ло выдома, шо Вона́ ма́е в жывоті́ од Ду́ха Свято́го». Гэта радкі з перакладу Новага Запавету на заходнепалескую гаворку, які зрабіў выдатны беларускі мовазнаўца Фёдар Клімчук.

Падаваць Святое Пісанне на мове бацькоў і дзядоў Фёдар Данілавіч пачаў яшчэ ў 1980-х гадах. «Пераклад выконваўся невялікімі кавалачкамі. Звычайна для перакладу браўся адзін верш. Часам крыху больш. Тэкст прачытваўся. Затым я ў думках перамяшчаўся ў Палестыну першай паловы I стагоддзя н. э., нібыта станавіўся непасрэдным назіральнікам тых падзей, якія апісаны ў Новым Запавеце. Зноў у думках перамяшчаўся ў Сіманавічы пачатку XX стагоддзя. І распавядаў сваім землякам, прадстаўнікам старэйшага пакалення тое, што пабачыў. Потым гэта паведамленне запісваў», — успамінаў дыялектолаг. Для перакладу ён выкарыстоўваў Новы Запавет на стараславянскай, рускай, польскай і ўкраінскай мовах.

Уявіце: разбураецца стары лад, адыходзіць старэйшае пакаленне, і ўсё менш застаецца носьбітаў традыцыйнай гаворкі, а вучоны прысвячае сваё жыццё перакладу кнігі на мову адной вёскі — Сіманавічы Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці, у якой нарадзіўся. Ён быў упэўнены, што дзякуючы такой працы не дасць роднай гаворцы сысці ў нябыт. Але яму ўдалося зрабіць куды больш. Пераклады Фёдара Клімчука абудзілі цікавасць да народных гаворак.





Цяжка знайсці чалавека, які б больш ведаў пра дыялекты заходнепалескай зоны. Фёдар Данілавіч мог расказаць пра асаблівасці гаворак ці не кожнай вёскі гэтага рэгіёна, пра людзей, якія там жывуць і якія паходзяць з гэтых населеных пунктаў. Ён ведаў і спяваў тысячу песень, запісаных на Палессі, кажуць, не абмінаў ніводнага канцэрта ці імпрэзы. Захапляўся народнай культурай і папулярызаваў яе. Фёдара Клімчука называюць адным з пачынальнікаў у беларускай этналінгвістыцы, і самыя першыя працы ён прысвяціў традыцыйнай народнай духоўнай культуры роднага сяла Сіманавічы. Вучоны пакінуў каля 250 навуковых артыкулаў, зборнікаў (між іншым, супрацоўнікі Акадэміі навук сёлета плануюць падрыхтаваць да выдання выбраныя творы свайго калегі).

Фёдар Клімчук звярнуўся да сваіх землякоў з прапановай выдаць на розных палескіх гаворках творы Льва Талстога. Дзякуючы намаганням вучонага з'явіліся таксама пераклады на дыялект Гамера, Гогаля, «Слова пра паход Ігараў».

Пры жыцці Фёдар Клімчук паспеў выдаць толькі частку перакладу Новага Запавету. На новае поўнае выданне «Палескай Біблії» грошы збіраліся праз краўдфандынг. І аказалася, што палескія дыялекты цікавыя не толькі жыхарам Берасцейшчыны. На прэзентацыі «Новага Завіту» гасцям не хапала месцаў, але людзі гатовы былі дзве гадзіны адстаяць, толькі б больш даведацца пра падарунак, які Фёдар Клімчук зрабіў для сваёй малой радзімы.

Фёдара Данілавіча не стала тры месяцы таму... Але яго справа працягвае жыць. Падчас святочнай прэзентацыі «Палескай Біблії», можна было пачуць носьбітаў народных гаворак. Гурты «Рада», «Кудмень» спявалі песні, запісаныя на Берасцейшчыне, а сямейны тэатр Ларысы і Аляксандра Быцко выкарыстаў пераклад Біблії, зроблены Фёдарам Клімчуком для батлеечнай калядной пастаноўкі. Сёння народныя гаворкі запатрабаваныя нават карыстальнікамі інтэрнэту, менавіта на Берасцейшчыне зарадзіўся праект «Дыялекты Беларусі» (інтэрактыўная карта), куды людзі актыўна дасылаюць гукавыя запісы, зробленыя ў розных беларускіх вёсачках.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота Андрэя САЗОНАВА.**



Гасцёўня

# ЗЯЛЁНАЯ

## Як ажываюць палотны

**«Мы будзем размаўляць галасамі сваіх дзяцей» — такімі словамі скончылася інтэрв'ю з барысаўчанінам Міколам Рыжым, сынам вядомага мясцовага мастака, таксама Міколы Рыжага. Міколу старэйшага ўсе вельмі любілі ў горадзе і дагэтуль моцна цэняць. Цікава, што на работах бацькі так шмат выяў малога сына — ён разам з маці ў вёсцы на сенажаці, ён у атачэнні малюнкаў гістарычных асоб, ён дома ў майстэрні бацькі, дзе, аказваецца, трэба зрабіць выбар...**
**Для сына бацька — узор паводзінаў і таго, да чаго варта імкнуцца ў жыцці. А для бацькі сын — не толькі крыніца любові, ён і вобраз мастацтва, які цяпер будзе прамаўляць да нас бясконца.**
**Глядзіш на карціны Рыжага... Дакладна прапісаныя, насычаныя партрэты. Але яшчэ больш уражваюць нацюрморты, зробленыя ў жанры гіперрэалізму, — слівы, яблыкі, грыбы, намаляваныя на іх, «як жывыя». Так і хочацца прыдбаць такое палатно, каб пасяліць гэтае садова-лясное царства ў сябе дома.**
**Найбольш уражваюць дзве нясконочаныя работы Рыжага — «Без назвы». Зробленыя ў даволі спакойнай, пясочнай каларыстыцы, яны аднак вабяць сваім фантастычным спалучэннем. На іх мы бачым сялян, якія зграбаюць сена, а ў цэнтры, замест стагоў — збаночкі з кветкамі — і ўсё глядзіцца вельмі арганічна. Цікава, што з работ, выкананых у такім брэйгелеўскім стылі, Рыжы пачынаў у свае маладыя гады. Праўда, у сілу розных абставін, пераходзіў на крыху іншую мастакоўскую сцяжыну. Аднак сапраўдным мастаком не пераставаў быць ні на хвіліну свайго жыцця, пра што мы пагутарылі з яго сынам:**

***— Мікола, нядаўна ў барысаўскай бібліятэцы экспанавалася выстаўка работ вашага бацькі. Вы з сям'ёй адчулі патрэбу сабраць разам некаторыя яго работы і прадставіць публіцы?***

— Арганізаваць выстаўку было ідэяй майго бацькі — планаваў зрабіць яе да свайго 65-годдзя. Падрыхтоўка адбывалася ў апошні год жыцця, ён не сумаваў... Аднак пазней усё арганізавала маці. Большасць выстаўленых карцін — з іх з бацькам дома. Шмат работ на выстаўку прадставілі арганізацыі або людзі, партрэты якіх ён пісаў, — літаральна знялі са сцен сваіх кватэр. А ў мяне асабіста дома вісіць вялікая гравюра з выявай Скарыны, — гэта быў бацькаў любімы дзеяч, якім ён вельмі захапляўся. У яго шмат работ, прысвечаных Скарыну.

***— Як думаеце, чаму Мікола Рыжы настолькі захапляўся гістарычнай тэмай?***

— Бо ён беларус — гэта нармальная практыка для чалавека, які жыве ў сваёй краіне. Цікавіцца сваімі каранямі, ведаць, хто ты і што, хто тыя людзі, якіх варта ставіць у прыклад іншым. Трэба разумець, што мой бацька агулам не проста захапляўся культурай, ён любіў месца, у якім жыў. І вельмі шмат часу і энергіі накіроўваў на тое, каб у нашым двары было ўсё добра. З дзяцінства, як мы пераехалі ў новы дом, які стаяў на пустцы, мы з бацькам кожны год увесну і ўвосень аддавалі шмат сіл, каб гэты невялічкі кавалак зямлі стаў зялёны, — сеялі траву, гарадзілі невялічкія плоцікі, каб яе не вытапталі, садзілі кусцікі і дрэвы. Дрэвы часта гінулі — то ламаў хтосьці, то акурат там трэба было камунікацыю правесці, таму іх выкарчоўвалі — аднак мы саджалі зноў і зноў, урэшце многія прыжыліся, і застаўся такі добры ўспамін для жыхароў горада.

***— А вы самі любіце Барысаў гэтаксама моцна, як бацька?***

— Так, я люблю гэты горад. Я амаль дзесяць гадоў жыў у іншых мясцінах, аднак потым вярнуўся сюды, адкрыў рэстарацыю — у першую чаргу для мясцовых жыхароў. І людзі сапраўды пачалі аб'ядноўвацца. Ёсць прыклады, калі месцічы пазнаёміліся тут і потым пажаніліся. Мы робім мерапрыемствы, якія павінны з'ядноўваць жыхароў у пэўныя сацыяльныя групы. Штотыдзень па серадах ладзяцца курсы «Мова нанова», канцэрты арганізоўваюцца, праводзіцца гульня «Мазгабойня».



***— Давайце вернемся да мастацтва вашага таты. Ён пісаў і гістарычныя сюжэты, і нацюрморты, і партрэты, і пейзажы. Ці не было гэта пэўным раз'яднаннем яго душы, унутранай канкурэнцыяй кірункаў дзейнасці?***

— Каб напісаць краявід, патрэбна было натхненне, як і для нацюрморта. А партрэты бацька маляваў усё жыццё, гэта было работай. Жывапісныя партрэты — толькі іх частка. Ён намаляваў больш за 100 графічных партрэтаў гістарычных асоб, — яны зроблены і ўвасоблены ў розных стылях, ад штэмпеляў і марак да паштовак. Ён шчыльна супрацоўнічаў з Белпоштай, там захоўваюцца яго архівы. Шмат працаваў у жанры станковай графікі, афармляў мноства кніг, падручнікаў, дзе таксама трэба было маляваць партрэты, у тым ліку гістарычных асоб. У яго шмат экслібрысаў — і на іх таксама выяўлены ў асноўным людзі, у шаржавым ці звычайным партрэтным стылі. Калі браць жывапіс, то ён ад пачатку імкнуўся спрабаваць новае. І найперш гэта нацюрморты. Яны былі арыгінальныя, ён складаў адметную кампазіцыю. Заўсёды сэрца імкнулася да роднай зямлі, таму можна пабачыць на іх сухія галінкі раслін, грыбы, яблыкі. З нацюрмортамі яму хацелася эксперыментаваць, вынаходзіць новае, дадаваць пэўныя футурыстычныя рэчы, напрыклад, змяшаць краявід і нацюрморт.

***— Ёсць дзве работы, якія падпісаны «Без наз-***

# ЗЯМЛЯ Міколы Рыжага

***вы», дзе акурат змяшаныя краявід і нацюрморт. Раскажыце штосьці пра серыю.***

— Гэта няскончаныя работы, яны рабіліся ў апошні год перад смерцю. Насамрэч калісьці ён пачынаў менавіта з такіх работ. Першыя шэсць яго карцін, перададзеныя калісьці ў Галандыю, былі зроблены ў такім стылі. Потым ён шкадаваў, што развітаўся з імі, болей не хацеў ставіць такіх эксперыментаў. Але напрыканцы жыцця яшчэ некалькі разоў паспрабаваў зрабіць гэта. Мой бацька быў вельмі даверлівым, таму тыя першыя работы, якія трапілі ў Галандыю, можна сказаць, былі скрадзены. Ён не атрымаў за іх грошы. А цяпер пра лёс тых работ нічога не вядома. На іх былі намаляваны краявіды, у якіх — шмат насякомых, матылькоў, конікаў, выпісаных дасканала. Бацька іх лавіў, а потым засушваў і з натуры маляваў вельмі скрупулёзна, карпатліва. На яго карцінах хтосьці лятае, хтосьці сядзіць, хтосьці яшчэ нешта робіць. Бацька стараўся напісаць іх у натуральную велічыню, каб яны выглядалі так, нібы мы іх сапраўды бачым. Работы былі дастаткова вялікія, таму часам здавалася, што матылёк проста сеў на карціну, а не намаляваны, — бацька рабіў так спецыяльна. Ён быў графікам, таму перадаць натуралізм было для яго надзвычай важна, асабліва ў першых работах. Патрэбна было, каб усё выглядала як жывое — так і здавалася.

***— Тое, што ён перастаў эсперыментаваць, звязана з сумнай гісторыяй з выкраданнем карцін?***

— Гэта была вельмі карпатлівая праца, такія карціны вымагалі шмат часу. Каб напісаць адну, у яго сыходзіла больш за месяц, два. А есці ж хацелася, грошы былі патрэбныя. Таму ён на пэўны час выбраў больш просты стыль, каб стварэнне карціны займала не так шмат часу і каб яна менш грошай каштавала, каб прадавалася прасцей. Ён быў не знакамітым жывапісцам, бо пачаў займацца жывапісам пазней за сваіх аднакашнікаў. Таму калі адчуў сябе ўпэўнена ў гэтым стылі, яго сябры ўжо былі знакамітыя, маглі прадаваць свае работы за немалыя грошы. А калі ён прадаваў свае карціны, усе пыталіся: «Хто гэта такі? Шкарубу мы ведаем. Ксяндзова мы ведаем. А хто такі Мікола Рыжы, мы не ведаем». Таму тата не мог ставіць вялікія цэны на свае работы. Таму і выбіраў маляванне больш простых карцін — краявіда, нацюрморта, — каб яны хутчэй прадаліся. Часам ён пісаў дублікаты — калі маці вельмі падабалася пэўная карціна, яна забірала яе дадому, каб павесіць на сцяну, а тата пісаў другі варыянт.

Маці вельмі падтрымлівала бацьку. А ён сам выбраў шлях мастака з дзяцінства — і ні кроку ўбок. Толькі наперад, толькі ствараць карціны. Мастацтва праходзіла праз усё, што ён рабіў у жыцці. У нашай хаце, якую я жартам называю музеем, уся мэбля выраблена ім з дрэва. Былі чатыры браты Рыжых, усе з залатымі рукамі — двое добра малявалі і двое выдатна працавалі з дрэвам. Мабыць, апошняе перадалося ад дзеда. Скампанаваць, выразаць, выпіліць лобзікам — і каб усё было прыгожа. Ва ўсіх іх дома шмат такой драўлянай прыгажосці.

***— На карціне «Міколка» намаляваны вы ў дзяцінстве на фоне розных гістарычных асоб і прадметаў. Бацька мэтанакіравана выхоўваў у вас любоў да Радзімы?***

— Не, асаблівым чынам ён мяне не выхоўваў. Але калі ўлічыць, што чалавек заўсёды бярэ прыклады з жыцця, з соцыуму, у якім ён знаходзіцца, то ў маім соцыуме заўсёды быў толькі адзін чалавек, якім я захапляўся і ганарыўся, — гэта мой бацька, — таму я браў прыклад з яго. Але не было такога, каб ён садзіўся і нешта наўмысна мне расказваў. У нас дома гіганцкая бібліятэка, — часам я чытаў тое ж, што і ён. І мяне заўсёды цікавілі яго заняткі і захапленні, я заўсёды ім ганарыўся і хацеў быць да яго падобным. З ім я размаўляў на беларускай мове. Можа, адзіны выхаваўчы момант — тое, што ён аддаў мяне ў беларускамоўную гімназію. На час стварэння партрэта «Міколка» бацька ўжо доўга і карпатліва працаваў над афармленнем кнігі Уладзіміра Бутрамеева «Вялікія і славутыя людзі беларускай зямлі», за якую пазней атрымаў Гран-пры на конкурсе беларускай кнігі за ілюстрацыі. А на партрэце на фоне акурат змешчаны схематычныя малюнкі з гэтай кнігі.

***— Ёсць яшчэ адна карціна, дзе вы намаляваны, і побач у даволі ўльтыматыўнай форме напісана «Зрабі свой выбар»...***

— Партрэт быў зроблены для нашага дома, ён сведчыць, што бацьку не падабалася, што я вырашыў не быць мастаком. А бацька вельмі гэтага хацеў, таму мы сварыліся. У мяне быў свой стыль, я па-свойму ўсё ўспрымаў, а бацька казаў глядзець, як робіць ён, і рабіць тое ж самае. Я ж не хацеў паўтарацца — калі і быць мастаком, то іншым. Калі мне споўнілася 16—17, я вырашыў, што мастаком не буду. Бо ўсё жыццё пражыць, спрачаючыся з бацькам, не хацеў.

***— Дзе бацька браў інфармацыю для сваіх гістарычных работ?***

— У нас дома вельмі вялікая бібліятэка, у ёй шмат гістарычнага матэрыялу. Бацька шмат ездзіў па архівах, шукаў фотаздымкі, каб людзі на партрэтах атрымаліся падобнымі. Калі маляваў выявы Купалы і Коласа для Белпошты, вырашыў, што на заднім фоне намалюе хацінкі, у якіх яны жылі, — для гэтага спецыяльна ездзіў туды, рабіў фотаздымкі, з якіх маляваў, а таксама звяраў са старымі фотаздымкамі. Калі казаць пра гісторыю, то ён вельмі шкадаваў, калі ў нас у Барысаве разбураліся культурныя помнікі. З яго майстэрні, у старым гістарычным будынку, хацелі зрэзаць балконы — ён настаяў, каб яны захаваліся. Цяпер ім больш за 100 гадоў, іх гістарычная каштоўнасць відавочная.



***— Ці адчуваеце вы сябе прадаўжальнікам бацькавых традыцый?***

— Так, натуральна. Як кажуць, мы будзем размаўляць галасамі сваіх дзяцей. Я чалавек, які вельмі шмат узяў ад свайго бацькі. Гэта мой найлепшы настаўнік у жыцці. Я заўсёды паважаў і браў з яго прыклад. Паводзіны, прынцыповыя адносіны да сацыяльных рэчаў і да гісторыі, — гэта ўсё мне перадалося.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ,**
*г. Барысаў.*

Сваімі словамі



# БЕЛАРУСЬ, У ЯКОЙ ЖЫВЁМ

**Карціну Валерыя Шкарубы я аднойчы пабачыла ў Нацыянальным мастацкім музеі. І што называецца, палюбіла з першага погляду. Што прыемна, завітваючы, пры нагодзе, да карціны зноў, я не расчароўвалася ў сваіх пачуццях, а наадварот разумела, што аб'ект сімпатый выбраны правільна — і сэрца аддаць яму можна. Так у мяне з'явіўся любімы сучасны беларускі мастак і яго «Восеньскае свята».**



Неяк я пабачыла, што карціны Шкарубы выстаўляюцца ў музеі Гомельскага палацава-паркавага комплексу. Падумала: «А ці не з'ездзіць, бо вельмі ж хочацца» — аднак зрабіць гэтага не паспела, бо выстаўка ўжо закрывалася. Таму, калі ў сяброўкі ў сацыяльных сетках пабачыла, што Валерый Шкаруба выстаўляецца ў Барысаве, падумала: нельга губляць ні тыдня! Сказана — зроблена.

Чым я была прыемна здзіўлена і зусім крышачку засмучана — экспазіцыя мастака ў Барысаве пастаянная (а мне ж яшчэ артыкул пісаць, патрэбна навіна). Валерый Шкаруба — барысаўчанін, прызнаны не толькі ў беларускай сталіцы, але і ва ўсім свеце. Многія культурніцкія пляцоўкі ў розных гарадах прапаноўвалі яму свае плошчы для пастаяннай выстаўкі. Аднак Шкаруба вырашыў, што калі дзесьці і быць яго карцінам на пастаяннай аснове, дык толькі ў родным Барысаве. Некалькі гадоў таму адным махам падарыў 30 сваіх карцін гораду — і галерэя яго работ адкрылася ў бібліятэцы імя Каладзеева. З тых часоў кожны год мастак завітвае сюды ў дзень адкрыцця галерэі і дорыць яшчэ па адной сваёй рабоце. На сёння ў галерэі прадстаўлена 33 карціны мастака. Нават лічба прыгожая, пагадзіцеся.

Карціны Валерыя Шкарубы выклікаюць у наведвальнікаў самыя розныя пачуцці. Для людзей з замежжа, якія калісьці пакінулі Беларусь, гэта смутак і сум аб страчаным. Некалькі жанчын з Ізраіля, калі пабачылі карціну «Сумны змрок» з выяўленай на ёй старой хаткай, плакалі каля яе. Больш маладое пакаленне зазвычай перажывае іншыя пачуцці — яны бачаць на палотнах прыгажосць, спакой і чысціню.

Мастак піша выключна беларускую прыроду. Калі бывае дзесьці за мяжой, часам робіць эцюды, аднак ніколі не пераносіць іх на вялікія палотны. Беларускія пейзажы, прычым без людзей, без жывёл, толькі зрэдку з вясковымі будынкамі, — вось што сапраўды натхняе гэтага творцу. Ён часта піша дарогу, прычым яна ніколі не абрываецца. Аўтару блізкія памежныя станы прыроды — позняя восень, ранняя вясна, світальны туман, захад сонца — усё гэта таксама сімвалы шляху, руху ў новы этап.

Колеры яго работ з аднаго боку вельмі спакойныя — цікава, што нават вясновая дарога з калянінамі, разбітая паводкай і толькі месцамі прыкрытая снегам, выглядае ў яго чыстай, нават адухоўленай. Калі прыглядзецца, у яго палітру шчодра дададзены бірузовы, зялёны, ружовы, светла-фіялетавы, залаты колеры. Яны дапамагаюць стварыць уражанне пэўнай пяшчоты. Вельмі яскравымі і эмацыянальна цэльнымі атрымліваюцца яго карціны, на якіх выкарыстаны глыбокі сіні колер. Чысты, халодны, без прымешак лішняга сіні ў яго выкананні атрымліваецца вельмі радасным. Карціна «Слупы» — сілуэты цёмна-шэрых электрычных слупоў, купка дрэў, лапік зямлі, усё гэта на фоне сіняга гарызонту — такога, які мы маглі бачыць яго ў прыродзе, калі сонца ўжо схавалася. З аднаго боку, гэта вельмі простая карціна. А з другога, яна настолькі цэльная, што міжволі хочацца параўнаць яе з «Чорным квадратам» Малевіча. Прычым Шкаруба тут нават выйграе, бо здолеў цэльна ўвасобіць складаны нябесна-марскі колер.

Валерый Шкаруба займаецца мастацтвам з самага дзяцінства. Калі быў малы, мог прачнуцца сярод ночы і пайсці на эцюд у лес — каб там пісаць перадсвітальны туман. Цяпер мастак прыгадвае, што гэта самыя шчаслівыя ўспаміны яго дзяцінства. Дарэчы, малым хлопчыкам ён моцна заікаўся. Таму ўтульней было застацца аднаму, чым бавіць час з сябрамі ў кампаніі. Цяпер творца кажа, што яму ў гэтым плане вельмі пашчасціла: адчуваць утульнасць сам насам з сабой. Бо адзінота патрэбна кожнаму творчаму чалавеку — і мастаку, і пісьменніку, і кампазітару — для таго, каб ствараць.

Цікава і тое, што Валерый Шкаруба тройчы не мог паступіць на аддзяленне жывапісу ў Акадэмію мастацтваў (колішні Тэатральна-мастацкі інстытут). Аднак, як згадвае сам, ніколі не хваляваўся і не сумняваўся ў абраным шляху — ведаў, што рана ці позна паступіць. У выніку з чацвёртага разу ён паступіў, праўда, на аддзяленне графічнага дызайну.

Праўду кажучы, што ўсё да лепшага. Цяпер мастацтвазнаўцы пачалі вылучаць жывапіс у стылі Шкарубы — зроблены тонкімі графічнымі мазкамі.

* * *

Мастак піша тую Беларусь, у якой мы з вамі жывём, — ва ўсякім разе вяскоўцы. Бачная яе стрыманая, маляўнічая, прывабная прырода. Праўда ў нашай культуры прынята звязваць гэтыя вобразы з элегіяй, сумам па чымсьці страчаным. І вось тым каштоўныя работы Шкарубы: глядзіш на іх і бачыш тое, што бачыў тысячы разоў. І гэтым разам табе не сумна і не абыякава. Ты радуешся і дзякуеш, што роднае хараство гэтаксама ўбачыў мясцовы майстра сусветнага ўзроўню.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

## У Расію — па спецтарыфах

**Беларуская чыгунка анансавала спецыяльныя тарыфныя прапановы на асобныя цягнікі ў Расію ў 2019 годзе. Продаж білетаў на іх пачынаецца з 25 снежня, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі.**

Беларуская чыгунка з 1 да 28 лютага 2019 года прапануе дадатковую зніжку ад 15 % да існуючых тарыфаў пры праездзе ў зносінах з Расійскай Федэрацыяй у купэйных вагонах цягнікоў: № 95/96 Брэст — Масква; № 308/307 Баранавічы — Саратаў, уключаючы прычапныя і бесперасадачныя вагоны: Брэст — Саратаў у складзе цягнікоў №№ 650/308 — 307/649, Віцебск — Саратаў у складзе цягнікоў № 605/308 — 307/602, Гомель — Саратаў у складзе цягнікоў №№ 83/308 — 307/55. Для гэтых цягнікоў захоўваецца прымяненне зніжак у залежнасці ад тэрмінаў (глыбіні) продажу і пры адначасовым афармленні праязных дакументаў — туды-назад.

## Пачаліся палёты ў Варонеж

**ААТ «Авіякампанія «Белавія» пачала выкананне новага рэйса Мінск — Варонеж — Мінск.**

Палёты будуць ажыццяўляцца на рэгулярнай аснове чатыры разы на тыдзень з вылетам з Мінска ў 23.05 па панядзелках, серадах, чацвяргах, суботах і прыбыццём у Міжнародны аэрапорт Варонеж на наступны дзень у 0.30. Час у шляху складзе 1 гадзіну 30 хвілін. Кошт білетаў у адзін бок ад 96 еўра, уключаючы таксы і зборы, і ад 179 еўра — туды-назад.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Солигорскторг» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества:

**Лот 1:** **автогараж № 1,** инв. № 644/С-56582, общей площадью 34,9 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625050100001003035 площадью 0,0051 га по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Строителей, 2Л.

***Начальная цена с НДС (20 %) – 5 880,00 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – 588,00 бел. руб.***

**Лот 2:** **автогараж № 2,** инв. № 644/С-56579, общей площадью 35,5 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625050100001003036 площадью 0,0050 га по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Строителей, 2К.

***Начальная цена с НДС (20 %) – 7 560,00 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – 756,00 бел. руб.***

**Лот № 3:** **автогараж № 6,** инв. № 644/С-56583, общей площадью 27,1 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625050100001003039 площадью 0,0038 га по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Строителей, 2Е.

***Начальная цена с НДС (20 %) – 5 239,20 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – 523,00 бел. руб.***

**Лот № 4:** **автогараж № 7,** инв. № 644/С-56584, общей площадью 35,1 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625050100001003040 площадью 0,0050 га по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Строителей, 2Д.

***Начальная цена с НДС (20 %) – 7 800,00 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – 780,00 бел. руб.***

**Лот № 5:** **здание продовольственного склада № 1,** инв. № 644/С-34916, общей площадью 1 604,9 кв. м и многолетние насаждения (береза – 5 шт.), расположенные на земельном участке с кадастровым номером 625000000012002429 площадью 0,5314 по адресу: Минская область, Солигорский район, район ст. Калий – 1.

***Начальная цена с НДС (20 %) – 173 754,60 бел. руб. Цена снижена на 50 %. Задаток 10 % от начальной цены – 17 375,00 бел. руб.***

**Лот № 6:** **павильон** инв. № 644/С-34948 общей площадью 120,0 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625050100001003022 площадью 0,0306 по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Л. Комсомола, 44.

***Начальная цена с НДС (20 %) – 83 160,00 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – 8 316,00 бел. руб.***

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB301210 82600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объектов производится в следующем порядке:

- по Лотам №№ 1–4 – в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи;

- по Лоту № 5 – в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. **Возможно предоставление рассрочки оплаты** объекта с внесением платежей в следующем порядке: оплата 30 % стоимости имущества производится в течение 20 (двадцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи, оставшиеся 70 % стоимости имущества – в течение 12 (двенадцати) календарных месяцев (по 5,8 %) либо по соглашению между сторонами на иных условиях договора;

- по Лоту № 6 – в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. **Возможно предоставление рассрочки оплаты** объекта с внесением платежей в следующем порядке: оплата 40 % стоимости имущества производится в течение 20 (двадцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи, оставшиеся 60 % стоимости имущества – в течение 3 (трех) календарных месяцев (по 20 %) либо по соглашению между сторонами на иных условиях договора.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в следующем размере: по лотам №№ 1–4 в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лоту № 5 – 3 (трех) процентов, по лоту № 6 – 4 (четырех) процентов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 23.11.2018.

**Аукцион состоится 27.02.2019 в 12.00 по адресу:** г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 26.02.2019 до 16.00 по указанному адресу. Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.

УНН 600122715.

Татьяна, тел.: 0174-222 360, 029 501 43 19

6 марта 2019 г. №2-С/2019

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ в г. Гомеле

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение | Наличие ограничений | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку документации, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | в районе ул. Брянской, 158 | 340100000002006221 | 0,1491 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | охранные зоны объектов газораспределительной системы *Обременение – подсыпка земельного участка* | 34 949,04 | 1 750,00 | 2 288,94 |
| 2 | по ул. Витебской 1-й, 27 | 340100000002006220 | 0,0623 | | зона санитарной охраны водопроводных сооружений | 17 375,47 | 900,00 | 2 357,82 |
| 3 | по ул. Узовской, 35 микрорайона «Прибор-Западный» | 340100000005007559 | 0,1124 | | охранная зона электрических сетей *Обременение – дикорастущая древесно-кустарниковая растительность, строительный мусор* | 4 012,68 | 200,00 | 3 493,81 |

1. Организатор аукциона – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).

2. Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке организации и проведения открытого аукциона по продаже земельных участков в ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ в г. Гомеле, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008г. № 462. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий, необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. № 3-6, 3-14).

3. **Аукцион состоится 6 марта 2019 г. в 15.00 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115,** при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, земельный участок предоставляестя этому лицу при его согласии с внесением платы в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр», в указанные в извещении сроки, следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того, **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указание транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе (в случае непобеды на аукционных торгах).**

Необходимые документы: 4.1 граждане – копию документа, содержащего их идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования, при необходимости нотариально удостоверенную доверенность;

4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.4 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, юридические лица, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность и его копию.

5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

*6. Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукцина, за земельный участок **для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, возмещает затраты на проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной ифраструктуры к земельному участку** (не распространяется на граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий). Величина затрат определяется администрацией района г. Гомеля по месту нахождения земельного участка при выдаче разрешительной документации на возведение одноквартирного жилого дома.*

7. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

8. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 29 января по 4 марта 2019 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00-13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6, 3-14. Заключительная регистрация зарегистрированных участников аукциона с 14.30 в день проведения аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. № 115. Контактный телефон – 41-97-86. Информация размещена на сайте: www.qomel.qov.by либо geodezcentr.by**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного аукциона

ЛОТ 1:
- капитальное строение, инв. № 440/С-11127 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина «Универмаг»), обшей площадью 1498,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, 100;
- капитальное строение, инв. № 440/С-12947 (назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – водопроводная сеть), протяженностью 56,0 м, расположенное по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, водопроводная сеть, 100;
- капитальное строение, инв. № 440/С-12946 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование - канализационная сеть), протяженностью 21,4 м, расположенное по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, канализационная сеть, 100;
- капитальное строение, инв. № 440/С-12945 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование - тепловая сеть), протяженностью 11,0 м, расположенное по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, тепловая сеть, 100

Обременения со стороны третьих лиц в виде аренды: 53,7 кв. м сроком до 28.02.2019 г.; 393 кв. м сроком до 20.09.2021 г.

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 424950100001002564, площадью 0,1558 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли (для обслуживания здания магазина «Универмаг»)), расположенном по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, 100

Начальная цена продажи – 832 320 р. (восемьсот тридцать две тысячи триста двадцать рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 41 616 р. (сорок одна тысяча шестьсот шестнадцать рублей)

Продавец – Ошмянский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231103, г. Ошмяны, ул. Советская, 130, тел. 8-01593-76-705

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 14 февраля 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; физическим лицом – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; юридическим лицом и ИП резидентами Республики Беларусь – заверенные копии учредительных документов; юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык

При подаче документов на участие в аукционе представителем, организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.

***Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 12.12.2018 г.***

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**
**Последний день приема заявлений – 11 февраля 2019 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

Спорт-тайм

# БЕЛАРУСКА — У ДЗЯСЯТЦЫ НАЙМАЦНЕЙШЫХ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра абноўлены рэйтынг WTA, развязку чэмпіянату свету па гандболе і іншых прыкметных падзеях у свеце спорту.**

***1.*** ***Эльвіра Герман заваявала сярэбраную ўзнагароду на турніры PSD Bank Indoor Meeting у Дортмундзе (Германія).*** У фінальным



забегу на 60 метраў з бар'ерамі апярэдзіць беларуску змагла толькі Памэла Дуткевіч з Германіі. Адзначым, што паказаны вынік Эльвіры Герман (8,00 сек.) — асабісты рэкорд беларускі на 60 метраў з бар'ерамі. «Задаволена, як цяпер атрымліваецца старт. Над гэтым кампанентам доўга працавалі з трэнерамі, хацелі дамагчыся выразнага выхаду з калодак, зараз гэта асноўная задача. Паказаць хуткія секунды дапамаглі і саперніцы, побач з якімі неабходна бегчы хутчэй», — адзначыла Эльвіра Герман.

У Дортмундзе выступілі яшчэ два беларускія атлеты. Бар'ерыст Віталь Парахонька заняў першае месца з вынікам 7,68 сек. Анастасія Міронычык-Іванова ў скачках у даўжыню ў першай жа спробе паказала вынік 6 метраў 60 сантыметраў і размясцілася не першым радку выніковага пратакола.

Нагадаем, вядучыя лёгкаатлеты плануюць выступіць на чэмпіянаце Беларусі ў закрытых памяшканнях, які пройдзе з 29 да 30 студзеня ў магілёўскім спарткомплексе «Алімпіец».

***2.*** ***Арына Сабаленка ўпершыню ў кар'еры ўзнялася на 10-е месца ў рэйтынгу WTA, а японская тэнісістка Наомі Осака ўпершыню стала першай ракеткай планеты.*** Да гэтага прадстаўнікі Японіі ніколі не ўзначальвалі сусветны рэйтынг ні ў мужчын, ні ў жанчын. Нагадаем, на мінулым тыдні 21-гадовая Наомі стала пераможцай першага ў сезоне турніру серыі «Вялікага шлема» — адкрытага чэмпіянату Аўстраліі.

Аляксандра Сасновіч знаходзіцца на 33-м месцы, Вікторыя Азаранка — на 51-й пазіцыі, Вера Лапко займае 63-е месца.

***3.*** ***Баскетбалісты «Цмокі-Мінск» саступілі лідару Адзінай лігі ВТБ маскоўскаму ЦСКА 101:61.*** Самым выніковым у складзе чэмпіёнаў Беларусі стаў Віталь Лютыч, які набраў 19 ачкоў. Для ЦСКА гэта 14-я вікторыя ў 15 матчах.

У гэтым сезоне мінскія «драконы» перамаглі ўсяго двойчы ў 14 праведзеных сустрэчах, і займаюць апошняе, 14-е месца ў турнірнай табліцы. Два наступныя матчы «банкаўскага» турніру падапечныя Расціслава Вергуна таксама правядуць у Мінску. 2 лютага адбудзецца гульня з казанскім УНІКСАМ, 10 лютага — паядынак з «Зенітам» з Санкт-Пецярбурга.

***4.*** ***Біятланістка Лаура Дальмаер перамагла ў гонцы з масавым стартам на этапе Кубка свету ў Антхольцы (Італія).*** Беларуска Ірына Крыўко ў сярэдзіне гонкі займала высокае другое месца, але на чацвёртым агнявым рубяжы дапусціла промах, які не дазволіў ёй узысці на п'едэстал. І ў выніку заняла толькі сёмае месца.

***5.*** ***Гандбалісты зборнай Даніі ўпершыню ў гісторыі сталі чэмпіёнамі свету.*** У вырашальным паядынку за залатыя медалі ў дацкім Хернінгу гаспадары сусветнага першынства ўпэўнена перайгралі сапернікаў з Нарвегіі — 31:22. Лідар зборнай Даніі Мікель Хансен прызнаны самым каштоўным гульцом 26-га сусветнага першынства. Ён жа стаў найлепшым бамбардзірам турніру, закінуўшы 72 мячы ў 10 матчах.



«Бронзу» заваявалі гандбалісты Францыі, якія перамаглі ў матчы за 3-е месца зборную Германіі — 26:25.

Наступны мужчынскі гандбольны ЧС адбудзецца ў 2021 годзе ў Егіпце. У ім упершыню возьмуць удзел 32 каманды, а не 24, як раней.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Даты | Падзеі | Людзі

**29 СТУДЗЕНЯ**

У краіне

**1864** год — жыхарка Мінска Фрумкіна звярнулася па дазвол адкрыць на вуліцы Аляксандраўскай у Мінску бровар, і неўзабаве Мінскае губернскае праўленне прыняло рашэнне аб яго адкрыцці. У 1893 годзе бровар купіў граф Чапскі, і ў 1894 пабудаваў мураваны будынак. Пры ім прадукцыя атрымлівала медалі і пахвальныя граматы на ўсерасійскіх выстаўках. У 1898 годзе бровар купілі аўстрыйскія купцы браты Лекерты, якія валодалі заводам да 1917 года. Пры іх завод увахodзіў у аўстрыйска-чэшскае АТ «Багемія».

**1878** год — нарадзіўся Уладзімір Іванавіч Самойла, беларускі публіцыст, літаратурны крытык, філосаф. Удзельнічаў у беларускім літаратурна-грамадскім руху ў Мінску. У 1906 годзе — адзін з заснавальнікаў кнігавыдавецкага таварыства «Мінчук». Пры яго садзейнічанні ў газеце «Северо-Западный край» 28 мая 1905 года быў апублікаваны на беларускай мове верш Я. Купалы «Мужык» — першае выступленне паэта ў друку. Пісаў артыкулы пра творчасць Г. Ібсена, А. Блока, Л. Андрэева. Выступаў па пытаннях грамадска-палітычнага жыцця і вызваленчага руху. Аўтар публікацый пра помнікі старажытнай літаратуры, а таксама па пытаннях гісторыі беларускага мастацтва і музыкі. Памёр у 1941 годзе.

**1884** год — нарадзіўся Антон Іванавіч Луцкевіч, беларускі палітычны і грамадскі дзеяч, гісторык, публіцыст, літаратурны крытык. З 1906 года ў Вільні, выдаваў газету «Наша доля», «Наша ніва». У друку выступаў пад псеўданімам Антон Навіна. У 1921 годзе ўзначальваў Беларускі нацыянальны камітэт у Вільні, заснаваў Беларускую школьную раду, якая пазней зліласа з Таварыствам беларускай школы. Выкладаў у Віленскай беларускай гімназіі. У 1927 годзе арыштаваны польскімі ўладамі, судом апраўданы. У пачатку 1930-х адышоў ад палітычнай дзейнасці, працаваў у Беларускім музеі, выступаў з лекцыямі. Аўтар кніг, брашур, артыкулаў па гісторыі Беларусі, беларускім правапісе, гісторыі беларускага адраджэння, літаратурна-крытычных артыкулаў. У 1939 годзе рэпрэсаваны. Памёр у 1946 годзе. Рэабілітаваны ў 1989 годзе.

**1897** год — нарадзіўся Генадзь Яўгенавіч Змудзінскі, беларускі мастак. Адзін з заснавальнікаў беларускай савецкай кніжнай графікі. Афармляў кнігі беларускіх пісьменнікаў, казкі. Аўтар твораў станковай графікі «Пагром», «Бежанцы», «Згода нявесты» і інш. Аўтар маркі Беларускага дзяржаўнага выдавецтва, эскіза ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР і граматы да яго. Памёр у 1938 годзе.

У свеце

**1860** год — нарадзіўся Антон Паўлавіч Чэхаў, рускі пісьменнік. Ганаровы акадэмік Пецярбургскай АН (у знак пратэсту супраць адмены царом абрання М. Горкага ганаровым акадэмікам разам з В. Караленкам у 1902 годзе адмовіўся ад звання). Працаваў земскім урачом. Літаратурную дзейнасць пачаў з фельетонаў і гумарыстычных апавяданняў. Найбольшы ўплыў на развіццё сусветнай драматургіі зрабілі яго лірыка-псіхалагічныя п'есы «Чайка», «Дзядзька Ваня», «Тры сястры», «Вішнёвы сад». На беларускую мову яго творы перакладалі Я. Брыль, І. Грамовіч, К. Крапіва, І. Шамякін. П'есы Чэхава ставіліся і ставяцца ў беларускіх тэатрах. Памёр у 1904 годзе.

**1866** год — нарадзіўся Рамен Ралан, французскі пісьменнік, музыказнавец, грамадскі дзеяч. Лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры. Памёр у 1944 годзе.

**1886** год — дзень нараджэння аўтамабіля — Карл Бенц атрымаў патэнт на свой першы аўтамабіль. Першы аўтамабіль Бенца ўяўляў сабой трохколавы двухмесны экіпаж вагой 250 кг на высокіх колах са спіцамі. На яго Бенц паставіў свой новы чатырохтактавы бензінавы матор з вадзяным ахаладжэннем магутнасцю 0,9 к.с. Цыліндр размяшчаўся гарызантальна над воссю вялікіх задніх колаў і прыводзіў іх у рух праз адну раменную і дзве ланцуговыя перадачы. Машына развівала смяхотную па нашых мерках хуткасць — 16 км/г, але па тых часах гэта была вельмі прагрэсіўная канструкцыя. Экіпаж быў урачыста названы Motorwagen. Пасля таго, як вынаходніцтва прайшло шматлікія выпрабаванні і некаторыя дапрацоўкі, Motorwagen атрымаў Германскі Імператарскі патэнт № 37 435. У 1887 годзе першы ў свеце аўтамабіль дэбютаваў на выстаўцы ў Парыжы.



## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.02 | 17.44 | 8.42 |
| Віцебск — | 8.57 | 17.29 | 8.32 |
| Магілёў — | 8.52 | 17.34 | 8.42 |
| Гомель — | 8.43 | 17.37 | 8.54 |
| Гродна — | 9.16 | 18.00 | 8.44 |
| Брэст — | 9.11 | 18.06 | 8.55 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 28 студзеня.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

**Імяніны**

*Пр. Максіма, Пятра.*
*К. Ганны, Валерыя, Зянона, Міхала, Францішка.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Калі нявеста выязджае з загса, яна ўжо губляе 30 % кошту.**

Дзеці — кветкі жыцця :)

Марыне 3 гады — слаўны перыяд уласнасці, калі ўсё «маё». Гуляе з татам у двары, а ён яе дражніць:

— Маё дрэва!

— Не-е-е, гэта маё дрэва!

— Мая лавачка!

— Не-е-е, гэта мая лавачка!

— Мая гідраэлектрастанцыя! — і чакае, як дачушка адрэагуе на цяжкае і незнаёмае слова.

Марына падумала і зняважліва так адказвае:

— А мне яго і не трэба!

**У лесе завёўся дзіцячы Робін Гуд! Ён забірае грошы і каштоўнасці ў багатых і аддае маме.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 148.

Нумар падпісаны ў 19.30 28 студзеня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12